Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 СТУДЗЕНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 10 (27868) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Прэзідэнт зацвердзіў рашэнне па ахове дзяржаўнай граніцы на 2015 год**

СТАР. 2



**Мост Густава Эйфеля ў Баранавічах**

СТАР. 9

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Сяргей НАЛІВАЙКА, міністр па падатках і зборах:**

*«Калі казаць пра паняцце дармаедства, то, з аднаго боку, гаворка вядзецца пра асоб, якія вядуць асацыяльны лад жыцця, а з другога — пра свайго роду сацыяльных утрыманцаў, тых, хто займаецца нелегальным бізнесам, атрымлівае зарплату ў канвертах і не ў поўным аб'ёме выплачвае падаткі. У праекце дэкрэта аб стымуляванні працоўнай занятасці грамадзян прадугледжана норма, якая дазволіць грамадзяніну даказаць, што ён не з'яўляецца дармаедам. Чалавек можа прыйсці ў падатковую інспекцыю, паказаць дакументы, якія пацвярджаюць, што ён удзельнічае ў фінансаванні дзяржаўных расходаў, і гэта будзе прынята. Калі нават будзе дапушчана памылка на ўзроўні падатковай інспекцыі, то ў грамадзяніна ёсць права звярнуцца ў суд. Для эфектыўнай барацьбы з дармаедствам неабходна ўзмацняць меры адказнасці, ствараць атмасферу нецярпімасці да гэтай з'явы ў грамадстве».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.01.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14850,00 | ▼ |
| Еўра | 17200,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 228,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 936,91 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# СВЯТАЯ КРЫНІЦА ЖЫЦЦЯ

Мінчанка Людміла Жупранская з сынам Захарам ля крыніцы ў двары царквы ў гонар святога апостала Андрэя Першазваннага ў час асвячэння вады на Вадохрышча.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Фота Надзеі БУЖАН.

# АДКАЗНАСЦЬ ЗА СВАЁ СЛОВА

павінен несці кожны журналіст, лічыць міністр інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч

**Як Міністэрства інфармацыі збіраецца навесці парадак у інтэрнэце? Якой павінна быць газета, каб чытач штодзень упускаў яе ў свой дом? Якія змены ў бліжэйшы час чакаюць тэлегледачоў і радыёслухачоў? Пра гэта і не толькі наша размова з Ліліяй Станіславаўнай.**

***— Пачнём, калі дазволіце, з самага хвалюючага. У новы год інфармацыйнае поле ўвайшло з сур'ёзнымі пераменамі. Гэта ў першую чаргу звязана з тым, што з 1 студзеня ўступілі ў сілу папраўкі ў Закон «Аб сродках масавай інфармацыі». Лілія Станіславаўна, раскажыце, калі ласка, падрабязней пра галоўныя навацыі.***

— Дзеянне закона аб СМІ цяпер распаўсюджваецца ў тым ліку і на інтэрнэт-рэсурсы (за выключэннем патрабаванняў аб дзяржаўнай рэгістрацыі). Гэта, бадай, самая галоўная навацыя. У прыватнасці, з уступленнем змен і дапаўненняў у сілу, інтэрнэт павінен прытрымлівацца тых жа прынцыпаў, што і друкаваныя СМІ, радыё і тэлебачанне: дакладнасць, законнасць, павага правоў і свабод чалавека, разнастайнасць думак, выкананне нормаў прафесійнай этыкі журналіста і агульнапрынятых нормаў маралі. Калі будзе выяўлена парушэнне закона, Міністэрства інфармацыі мае права вынесці папярэджанне ўладальніку інтэрнэт-рэсурсу і абавязак яго выдаліць супрацьпраўны матэрыял.

СТАР. 4

# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ — НАША КРОЎНАЯ СПРАВА

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў рашэнне па ахове дзяржаўнай граніцы краіны ў 2015 годзе

**Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што пагранічная бяспека знаходзіцца ў ліку важнейшых пытанняў дзяржаўнай палітыкі. Ён пацікавіўся тым, як выконваюцца даручэнні ў гэтай сферы, якія раней даваліся ўраду, Дзяржаўнаму сакратарыяту Савета бяспекі, Дзяржпагранкамітэту і іншым праваахоўным органам. Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў, што з пункту гледжання нарматворчасці ўсе неабходныя пытанні былі вырашаны, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

У студзені 2014 года на пашыранай калегіі пагранічнага ведамства абмяркоўваліся актуальныя праблемы. «Тады размова ішла аб аптымізацыі органаў пагранічнай службы, павышэнні правапарадку ў пагранічнай зоне, ролі абласных камісій у вырашэнні гэтых пытанняў, а таксама аб садзейнічанні з боку дзяржаўных органаў і мясцовага насельніцтва прыгранічных раёнаў у ахове нашых рубяжоў. Нічога новага ў гэтым няма. Так, як гэта было ў савецкія часы, калі граніцу ахоўваў увесь народ, асабліва той, які пражывае ў прыгранічны, — сказаў Прэзідэнт. — Але потым мы дадэмакратызаваліся да таго, што насельніцтва наогул забыла, што яно жыве ў прыгранічнай зоне. Вельмі важны напрамак — граніца з Паўночнаатлантычным альянсам, ЕС у нас аказалася занадта дэмакратычнай. Таму мы вырашылі вярнуцца да праверанага метаду, каб і насельніцтва было падключана да аховы дзяржграніцы. Але для гэтага трэба было ўзварушыць мясцовыя органы ўлады і само насельніцтва ў прыгранічны».

Кіраўнік дзяржавы таксама запатрабаваў далажыць яму, наколькі ўлічаны негатыўныя тэндэнцыі, якія праяўляюцца апошнім часам уздоўж беларускай дзяржаўнай граніцы ў суседніх краінах. «Што змянілася ў пагранвойсках, у свядомасці саміх пагранічнікаў у плане недапушчэння фактаў, якія былі вядомы, аж да беспакаранага прарыву дзяржграніцы, калі мы парушальнікаў тут лавілі па некалькі сутак?» — паставіў пытанне Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама пацікавіўся, як Дзяржпагранкамітэт вырашае задачы адстойвання дзяржаўных інтарэсаў Беларусі ў новых інтэграцыйных працэсах, у тым ліку ва ўзаемадзеянні з мытнымі органамі. «Не забывайце, што, выбудоўваючы адносіны як з Усходам, так і з Захадам, мы павінны разумець, што нацыянальныя інтарэсы — гэта наша кроўная справа і святы абавязак», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад па выніках аператыўна-службовай дзейнасці органаў пагранічнай службы ў 2014 годзе. Як паведаміў журналістам па выніках даклада старшыня Дзяржпагранкамітэта Леанід Мальцаў, усе даручэнні выкананы якасна. «Сур'ёзна ўмацавана пагранічная бяспека на ўсіх напрамках. Вялікая работа праведзена па інжынерным абсталяванні дзяржграніцы, укараненні сучасных тэхнічных сродкаў, што дало магчымасць павысіць якасць аховы дзяржграніцы і эфектыўнасць работы па ўмацаванні пагранбяспекі», — расказаў кіраўнік ведамства.

Акрамя таго, у прыгранічных раёнах актыўна праводзіцца прафілактычная работа, што дало магчымасць прыкладна на 15 працэнтаў знізіць колькасць правапарушэнняў, звязаных з парушэннем пагранічнага рэжыму, асабліва сярод мясцовага насельніцтва.

Пры зацвярджэнні рашэння на ахову дзяржграніцы Прэзідэнт даў неабходныя даручэнні на 2015 год па далейшым удасканаленні сістэмы пагранбяспекі, яе адаптаванні да сучасных умоў.

# ЦІКАВАСЦЬ ДА ФУТБОЛА

## Наша краіна разлічвае на правядзенне буйных спаборніцтваў па гэтым відзе спорту

**Беларусь разлічвае на далейшае супрацоўніцтва з УЕФА і правядзенне ў сябе буйных спаборніцтваў па футболе. Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з прэзідэнтам Саюза еўрапейскіх футбольных асацыяцый (УЕФА) Мішэлем Плаціні, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Мішэлю Плаціні за магчымасць правесці ў Беларусі ў 2016 годзе юнацкі чэмпіянат Еўропы па футболе сярод дзяўчат. «Вы можаце не сумнявацца, мы правядзём яго на самым высокім узроўні», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што ў 2014 годзе Беларусь паспяхова правяла чэмпіянат свету па хакеі.

«Мы поўныя рашучасці зрабіць юнацкі чэмпіянат найлепшым у гісторыі. І вы пагладзіце, наколькі мы можам арганізоўваць падобныя мерапрыемствы. Магчыма, вы даручыце нам больш сур'ёзныя спаборніцтвы ў гэтым відзе спорту», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў прэзідэнту УЕФА за вялікую ўвагу, якая надаецца Беларусі, гэтак жа як і іншым краінам, якія развіваюцца, і перш за ўсё за дапамогу і падтрымку, якія аказваюцца Беларускай федэрацыі футбола. «Тыя спецыялісты, якія прыязджаюць ад вас, выдатна нам дапамагаюць у развіцці футбола», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

«Вы на нас заўсёды можаце разлічваць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы заўсёды падтрымлівалі і будзем падтрымліваць вашы пачынанні, паколькі яны накіраваны на развіццё футбола, стварэнне раўнапраўных умоў для краін, якія ўдзельнічаюць або якія жадаюць удзельнічаць у спаборніцтвах па футболе».

«Футбол знаходзіцца на першым месцы ў свеце сярод відаў спорту. Сотні мільёнаў, а можа, і мільярды людзей захапляюцца ім і назіраюць за ім. У нас па масавасці гэта таксама спорт нумар адзін, — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. — Не магу сказаць, што мы дасягнулі нейкіх выключных вынікаў у футболе. Нават больш скажу: мы ўкладваем у футбол вельмі шмат сродкаў, але належнай аддачы, нават не фінансавай, гульнявой, не назіраем».

Мішэль Плаціні ў сваю чаргу адзначыў, што яму вядома, якая ўвага надаецца ў Беларусі развіццю футбола. «Мы ўважліва сочым за дасягненнямі беларускіх каманд і мяркуем, што ў будучыні Беларусь можа дасягнуць лепшых вынікаў», — сказаў ён. Прэзідэнт УЕФА выказаў задавальненне кантактамі, якія ўсталяваліся ў яго з кіраўніком беларускай дзяржавы і Беларускай федэрацыяй футбола. «Упэўнены, што разам мы зможам зрабіць шмат для развіцця футбола ў Беларусі», — падкрэсліў ён.

Андрэй КАБЯКОЎ:

# СТРОГІ КАНТРОЛЬ ЗА ЦЭНАМІ ЗАХАВАЕЦЦА

## Але ён не будзе вечным

**Аб гэтым прэм'ер-міністр заявіў днямі, даючы інтэрв'ю журналістам. Паводле яго слоў, кантроль за цэнамі — мера часовая і ўстаноўлена толькі на пераходны перыяд. «Рынак змяніўся, сітуацыя змянілася, магчымасці змяніліся, таму ўсім трэба падціснуцца», — сказаў прэм'ер-міністр. Гэта неабходна для таго, каб не было разбалансаванасці ў эканоміцы, растлумачыў ён.**



Фота БЕЛТА.

Кіраўнік урада ўдакладніў: «Як толькі будзе сфарміравана разуменне і прыведзены ў адпаведнасць патрэбнасці з магчымасцямі, зразумела, ад такога строгага рэгулявання мы адмовімся».

Неабходнасць прыняцця гэтай меры Андрэй Кабякоў растлумачыў тым, што, калі адбылася пэўная карэкцыя курса, у многіх з'явілася спакуса пабегчы ўслед за гэтым і з цэнавымі прапанаваннямі. «Мы ні ў якім разе не павінны дапусціць цэнавую гонку, — падкрэсліў прэм'ер. — Таму мы будзем рэгуляваць, падказваць, накіроўваць, будзем гаварыць з суб'ектамі гаспадарання, арганізацыямі аб тым, каб не дапусціць цэнавай разбалансіроўкі».

Андрэй Кабякоў не выключае, што нехта можа панесці пэўныя страты ў існуючай сітуацыі. «Але Прэзідэнт прад'явіў канкрэтнае патрабаванне: мы не павінны губіць бізнес, бізнес павінен працаваць. Але калі пры гэтым бізнесу давядзецца, як кажуць, закасаць рукавы або распрануцца па пояс, недзе прывесці свае затраты ў адпаведнасць з магчымасцямі, то гэта неабходна рабіць», — адзначыў прэм'ер-міністр.

### Пераход ад колькасных паказчыкаў да якасных

Цяпер рыхтуецца праграма дзейнасці ўрада на бягучы год. «Нейкіх асаблівых навацый у рамках гэтага дакумента не прадбачыцца. Упор будзе зроблены перш за ўсё на тое, каб ацэнка дзейнасці больш зводзілася ад колькасных да якасных паказчыкаў», — сказаў кіраўнік урада. Не менш важным павінна стаць і «прывядзенне сваіх патрэбнасцяў да нашых магчымасцяў».

Андрэй Кабякоў нагадаў, што пры падрыхтоўцы бюджэту на 2015 год у кіраўніка дзяржавы прайшоў шэраг нарад. Першапачаткова бюджэт разлічваўся зыходзячы з прагнозу цаны на нафту $100 за барэль, потым — $83. Цяпер цана на нафту крыху ніжэйшая за $50. «Натуральна, гэта патрабуе адэкватных мер рэагавання з нашага боку, таму ўрад падлічвае мадэль варыянтнага развіцця сітуацыі (і ўжо ёсць чарнавы варыянт), бо пакуль ніхто ў свеце не можа прадказаць, на якім узроўні спыніцца цана нафты, як у далейшым будуць развівацца эканамічныя падзеі ў нашых бліжэйшых партнёраў (Расіі, краінах СНД), у Еўрапейскім саюзе, дзе таксама не ўсё проста ў эканоміцы, — адзначыў Андрэй Кабякоў. — Гэта сведчыць аб тым, што мы павінны вельмі ўважліва пагладзець на свае бюджэтныя расходы».

Пры гэтым кіраўнік урада падкрэсліў: «Ні аб якім скарачэнні сацыяльных расходаў, выплат заработных плат і г.д. гаворкі не ідзе. Але тым не менш, ад таго, ад чаго можна адмовіцца, напэўна, давядзецца адмовіцца або вырашыць тую ці іншую праблему фінансавання крыху пазней». Галоўнае на гэты год — забяспечыць збалансаванае паступальнае развіццё беларускай эканомікі, рэзюмаваў прэм'ер-міністр.

### Міністрам трэба станавіцца больш самастойнымі

«Многія кіраўнікі міністэрстваў зводзяць сваю работу да таго, каб атрымаць пабольш грошай з бюджэту і атрымаць ільготы для падведамных арганізацый, якія не прадугледжаны, — адзначыў прэм'ер. — А паколькі гэта нейкія выключныя выпадкі, то, зразумела, іх калегі (Мінфін, Мінэканомікі і інш.) пішуць заўвагі, яны супраць гэтага». Нярэдка для ўрэгулявання сітуацыі даводзіцца ўмяшацца ўраду.

Такога, адзначыў Андрэй Кабякоў, быць не павінна. «Надышоў час перастаць прасіць, — падкрэсліў ён. — І ў гэтым плане трэба навесці парадак раз і назаўсёды. Не трэба хадзіць ні за льготамі, ні за дадатковым бюджэтным фінансаваннем. Табе даверана галіна — займайся гэтым». Прычым вынік павінна адчуваць уся галіна, а не асобныя падведамныя арганізацыі, адзначыў прэм'ер. Цяпер урад праводзіць аналіз паўнамоцтваў міністраў. Андрэй Кабякоў адзначыў, што, калі ўзнікне неабходнасць, будуць зроблены адпаведныя нарматыўныя замацаванні. Пры гэтым прэм'ер упэўнены — як толькі міністр перастане прасіць, паўнамоцтвы міністра рэзка ўзрастуць.

Як паведамлялася, прадстаўляючы Андрэя Кабякова на пасадзе, кіраўнік дзяржавы сказаў аб новай ролі міністраў — аб тым, што яны павінны адказваць за давераныя ім галіны, а таксама, што віцэ-прэм'ерам або прэм'ер-міністру пара перастаць указваць міністрам, што трэба рабіць.

### Дыверсіфікацыя экспарту — ключавое пытанне

Прэм'ер адзначыў, што сёння традыцыйныя рынкі, на якіх Беларусь умее і прывыкла працаваць (перш за ўсё гэта рынкі СНД, Расійскай Федэрацыі), адчуваюць пэўныя цяжкасці з рэалізацыяй прадукцыі, у тым ліку і беларускай. Гэта абумоўлена зніжэннем аб'ёмаў эканомікі, бюджэтных магчымасцяў, а таксама крэдытных магчымасцяў банкаўскіх сістэм.

«Таму галоўная задача, якую паставіў Прэзідэнт, — не страчваючы пазіцый на традыцыйных рынках, заняцца дыверсіфікацыяй экспарту, выйсці ў тыя рэгіёны і краіны, якія менш адчуваюць сённяшнія эканамічныя праблемы і ў якіх Беларусь у выніку існуючай структуры вытворчасці можа заняць свае нішы, — адзначыў Андрэй Кабякоў. — Перш за ўсё гэта датычыцца краін так званай далёкай дугі — нашых сярэднеазіяцкіх партнёраў, такіх як Кітай, В'етнам, Інданезія, Індыя, краін афрыканскага кантынента, Лацінскай Амерыкі».

У гэтых рэгіёнах, паводле слоў прэм'ера, ёсць патрэбнасць як у беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі, так і ў прадукцыі машынабудавання. «Суадносіны цаны і якасці прымальныя. Але неабходна навучыцца працаваць з гэтымі краінамі, таму што ўсюды ёсць свае традыцыі, уваходы на гэтыя рынкі. І нам трэба знайсці гэтыя ўваходы з тым, каб прадаваць, сама меней, той аб'ём прадукцыі, які з-за аб'ектыўных прычын можа быць не запатрабаваны на нашых традыцыйных рынках», — адзначыў кіраўнік урада. Пры гэтым аптымальным, паводле яго слоў, было б усё ж захаваць аб'ёмы прысутнасці на традыцыйных рынках і дабавіць у краінах «далёкай дугі».

■ Меркаванне

# ВЫКАРЫСТАЦЬ УСЕ МАГЧЫМАСЦІ

## Генеральны сакратар АДКБ Мікалай Бардзюжа лічыць неабходным дабівацца рэалізацыі мінскіх дамоўленасцяў для вырашэння канфлікту ва Украіне

**Аб гэтым гаворыцца ў яго каментарыі ў сувязі з кровапраліццем, якое працягваецца на ўкраінскай тэрыторыі.**

«Сур'ёзную заклапочанасць выклікаюць апошнія падзеі на паўднёвым усходзе Украіны. Адбываецца ўзмацненне канфрантацыі, актывізацыя баявых дзеянняў, у выніку чаго гінуць ваеннаслужачыя, мірныя людзі, разбураецца жыллё, бальніцы, школы», — адзначыў генеральны сакратар АДКБ. Ён падкрэсліў, што ніколі яшчэ баявыя дзеянні не прыводзілі да міру і ўрэгулявання палітычных супярэчнасцяў.

Мікалай Бардзюжа рашуча падтрымлівае неабходнасць спынення крывавага процістаяння, лічыць недапушчальным далейшую эскалацыю канфлікту, заклікае да працягу пошуку шляхоў яго мірнага вырашэння: «Надзвычай важна выкарыстоўваць для гэтага ўсе існуючыя магчымасці, у першую чаргу дабівацца рэалізацыі мінскіх дамоўленасцяў, неўхільнага захавання рэжыму цішыні, адводу цяжкай артылерыі ад ліній сутыкнення».

# Выбары для краіны

**У 2015 годзе ў Беларусі адбудуцца чарговыя прэзідэнцкія выбары. Хоць яны яшчэ не стартавалі, шэраг палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў ужо абазначылі сваю актыўнасць. Ідзе абмеркаванне і вылучэнне кандыдатур, заключаюцца альянсы, робяцца прагнозы.**

Галоўнай інтрыгай прэзідэнцкіх выбараў гэтага года з'яўляюцца іх тэрміны. Якіх толькі прагнозаў на гэты конт не робяць! Расказаць пра тое, якой будзе сёлетняя выбарчая кампанія, аглядальнік «Беларускай думкі» папрасіў старшыню Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзію Ярмошыну.

— На гэты момант самая верагодная дата прэзідэнцкіх выбараў — 15 лістапада 2015-га, — адзначыла Лідзія Ярмошына. — Гэта апошняя магчымая нядзеля для правядзення выбараў, паколькі ў адпаведнасці з Канстытуцыяй краіны яны павінны адбыцца не пазней чым за два месяцы да заканчэння паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы (тэрмін заканчваецца 21 студзеня 2016 года). Гэтая дата давядзена Цэнтральнай выбарчай камісіяй да ведама кіраўніка дзяржавы і папярэдне адобрана ім як самая верагодная. Нам няма сэнсу ствараць тут інтрыгу. Таму і палітычным партыям, і беспартыйным суіскальнікам пасады прэзідэнта варта арыентавацца на гэты тэрмін. Так прасцей ім і нам.

***Цалкам інтэрв'ю кіраўніка Цэнтрвыбаркама чытайце ў заўтрашнім нумары «Звязды».***

# Пабудуем дом разам

**42-і з'езд БРСМ праходзіць у Мінску ў фармаце адкрытага дыялогу «Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня»**

**На маштабны форум, які ладзіцца раз на тры гады, з'ехалася тысяча дэлегатаў з'езда з усёй краіны, а таксама госці і запрошаныя — усяго каля 3 тысяч чалавек. Распачаўся ён грамадзянска-патрыятычнай акцыяй «Мы памятаем і ганарымся!», прысвечанай 70-годдзю Вялікай Перамогі. Падчас мітынгу дэлегаты з'езда ўсклалі вянкі і кветкі да манумента Перамогі, хвілінай маўчання ўшанавалі памяць палеглых падчас Вялікай Айчыннай вайны.**

Затым усе накіраваліся ў кінатэатр «Кастрычнік», дзе не толькі пагладзелі мастацкі фільм «Дзяржаўная мяжа. Фільм дзявяты: Кур'еры страху», але і прынялі ўдзел у адкрытым дыялогу з аўтарамі і вядучымі акцёрамі карціны.

Сёння, у другі дзень з'езда, у Палацы Рэспублікі праходзіць выстава патрыятычнай фатаграфіі «Разам дом пабудуем», на якой прадстаўлены найбольш яркія моманты з жыцця арганізацыі. Падчас цэнтральнага мерапрыемства з'езда — адкрытага дыялогу «Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня» — будуць падведзены вынікі працы арганізацыі за тры гады, а таксама выбудавана стратэгія развіцця на бліжэйшыя некалькі гадоў. У час форуму таксама адбудуцца выбары Цэнтральнага камітэта (ЦК), Цэнтральнай кантрольнай камісіі (ЦКК), пасля чаго будуць абраны адпаведна першы сакратар ЦК і старшыня ЦКК БРСМ.

«2015-ы год для нас асаблівы, гэта Год моладзі, год 70-годдзя Перамогі. Мы ініцыіруем разгляд пытанняў па развіцці маладзёжнага руху з канкрэтнымі прапановамі для ўнясення ў адпаведныя праграмы, нарматыўна-прававыя акты», — адзначыў другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Андрэй Белякоў. Паводле яго слоў, адным з ключавых кірункаў працы арганізацыі ў 2015 годзе застанецца грамадзянска-патрыятычная тэматыка. «Наша задача — дайсці да кожнага ветэрана, дапамагчы, падтрымаць, выслухаць гісторыі гэтых людзей. Для гэтага рэалізуецца шэраг праектаў: «70 гадоў міру», «Героі Перамогі». Яшчэ адна тэма — маладзёжныя ініцыятывы. Працягнем развіваць праект «100 ідэй для Беларусі», больш актыўна ўзаемадзейнічаць з навукай і творчай моладдзю. Важны напрамак — занятасць маладых людзей. Мы працягнем развіваць рух студэнцкіх атрадаў».

**Надзея ПАЎЛАВА.**

■ Блізкая ўлада

# ПРА СПОРТ, ЯМЫ НА ВУЛІЦЫ ДЫ ПАШУ ДЛЯ ТРОХ КАРОЎ

**На «прамую лінію» да старшыні Брэсцкага аблвыканкама Анатоля Ліса ў мінулую суботу дазваніўся 41 жыхар вобласці**

**Пытанні закраналіся розныя: традыцыйна шмат зваротаў было па добраўпарадкаванні гарадскіх вуліц, па газіфікацыі сельскіх населеных пунктаў, будаўніцтве і прыватызацыі жылля. Трапляліся званкі нават па асабіста-сямейных пытаннях.**


Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Некалькі тэлефонных абанентаў з абласнога цэнтра ўздымалі падобныя праблемы: па вуліцы цяжка хадзіць з-за бездарожжа, з-за адсутнасці тратуараў, з-за працяглых рамонтаў. У прыватнасці, Ірына Брашчук, якая жыве ў доме па вуліцы Школьнай, расказвала, што восенню ў іх правялі каналізацыю, папярэдне зняўшы асфальт, ды так і пакінулі раскапаную вуліцу. Цяпер там прайсці амаль немагчыма, нельга нармальна абуцца. І, галоўнае, канца гэтаму не відаць.

Адразу за гэтым зваротам паступіў званок з вуліцы Шэрай, дзе жыхарка аднаго з дамоў скардзілася на падобныя нязручнасці. Паводле яе слоў, вуліца не толькі разбітая, але і вузкая. А на заездзе некаторыя нядобрасумленныя ўладальнікі аўтатранспарту пакідаюць свае машыны. У выніку ноччу, бывае, нават «хуткая дапамога» не можа заехаць па выкліку. Жанчына прапаноўвала паставіць забаронны знак для машын на ўездзе ў іх маленькую вуліцу.

Мікалай Дзямчук з Пінска скардзіўся на тое, што ў свой час недабудавалі раней запланаваную студэнцкую вёску ў Пінску. Інжынерныя сеткі пракладзены, а на далейшае, як патлумачылі заяўніку ў гарвыканкаме, грошай не хапіла. І жыльцы бліжэйшых дамоў каторы год церпяць разруху ў плане добраўпарадкавання. Ва ўсіх выпадках кіраўнікі гарвыканкамаў атрымалі ўказанне вывучыць заявы з выездам на месца і даць вычарпальныя адказы грамадзянам.

Па іншых зваротах даручэнне атрымалі кіраўнікі падраздзяленняў жыллёва-камунальнай службы.

А вось на просьбы аб газіфікацыі населенага пункта людзям тлумачылі: пытанне будзе вывучацца, але без усялякай гарантыі на яго вырашэнне ў бліжэйшы час. Газіфікацыя — справа надзвычай дарагая. У першую чаргу сеткі падводзяцца да аграгарадкоў і вялікіх населеных пунктаў. Пры гэтым, губернатар указаў на недапушчальнасць такой практыкі, прыклад якой прыводзіла заяўніца з вёскі Шпіталі. З жыхароў іх вёскі, як і жыхароў суседняй, сабралі грошы на праектна-каштарысную дакументацыю. А цяпер аб'явілі, што ў суседзяў газ будзе, а ім грошы вернуць.

Нечаканае пытанне паступіла з Маларыцкага раёна. Лабарантка СВК «Арэхава» скардзілася, што ўжо чатыры гады жыве ў так званым прэзідэнцкім доме, які яна атрымала ад гаспадаркі, але не мае рэгістрацыі па месцы жыхарства. Сельгаспрадпрыемства, паводле яе слоў, тлумачыць затрымку недахопам сродкаў на дакументы аб уводзенні ў строй дамоў, у якіх даўно жывуць людзі. Відома, без рэгістрацыі жыць можна, але часам узнікаюць праблемы... Маларыцкі райвыканкам атрымаў указанне паскорыць вырашэнне пытання.

Адна з заяўніц разам з асноўнай праблемай агучыла яшчэ адну: у іх вёсцы засталося тры каровы, а пашы ім ніхто не выдзяляе. Такі малы асабісты статак не бярэцца да ўвагі мясцовай уладай. Адказныя асобы атрымалі даручэнне вырашыць і гэту, здаецца, дробную, але важную для людзей праблему.

Некалькі зваротаў на «прамую лінію» датычылі развіцця фізкультуры і спорту. Так, маці юнага бейсбаліста Ірына Кічко выказала асцярогу, што з-за недахопу сродкаў дзеці далей не змогуць займацца гэтым любімым відам спорту. Яе запэўнілі, што бейсбол у Брэсце нішто згортваць не збіраецца, а на чуткі не варта звяртаць увагу.

Слушную, паводле заўвагі губернатара, прапанову выказаў Алег Сапешка, які жыве ў раёне будоўлі мікрараёна Вулька-3. Узвядзенне школы, якая значыцца ў генеральным плане забудовы горада, пакуль не распачата і ў найбліжэйшы час не плануецца, а пляц пад школу прастойвае. Алег Юр'евіч прапанаваў абсталяваць там часовую спартыўную пляцоўку з міні-стадыёнам, бегавымі дарожкамі і іншымі спартыўнымі прыстасаваннямі, каб вечарамі дарослыя і дзеці маглі патрэніравацца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

■ Погляд

# ДАСЛЕДАВАЦЬ — НЕ ХЛУСІЦЬ



**З набліжэннем даты прэзідэнцкіх выбараў партыі, разнастайныя грамадскія арганізацыі і рухі, што большы час знаходзяцца ў стане «зімовай спячкі», актывізуюцца, пачынаюць праводзіць пасяджэнні і нарады, ладзяць акцыі ды праз СМІ спрабуюць прыцягнуць увагу патэнцыйных выбаршчыкаў да сваёй дзейнасці.**

## ШЭРАЯ СФЕРА: САЦЫЯЛОГІЯ ЦІ ПАЛІТТЭХНАЛОГІЯ?

На жаль, не заўжды гэткая актывізацыя спрыяе развіццю палітычнай культуры нашай краіны, павышэнню эфектыўнасці функцыянавання грамадскіх інстытутаў ды стварэнню правілаў добрасумленнай канкурэнцыі. Вельмі часта ўдзельнікі палітычнага працэсу, у тым ліку тыя, што маюць рэгістрацыю па-за межамі нашай краіны, «укідваюць» у беларускую інфармацыйную прастору досыць сумнiўную інфармацыю дзеля ўласнага піяру, ачарнення канкурэнтаў або з яўна правакацыйнымі мэтамі ў інтарэсах канкурэнтаў беларускай дзяржавы.

Адной з традыцыйных шэрых сфер айчыннага палітычнага працэсу з'яўляюцца так званыя «незалежныя сацыялагічныя даследаванні», што выкарыстоўваюцца рознымі сіламі з мэтамі дэзынфармацыі насельніцтва і маніпуляцыі грамадскай думкай. Укідваючы праз папулярныя інтэрнэт-рэсурсы тыя ці іншыя «звесткі», «рэйтынгі» альбо «вынікі апытанняў», паліттэхнолагі жадаюць накіроўваць грамадскую думку ў патрэбнае для сябе рэчышча, ствараючы ў шараговых грамадзян штучную ілюзію ўсеагульнага ўхвалення або асуджэння таго ці іншага грамадскага лідара, дзяржаўнага службоўца ці непасрэдна крокаў ураду ў знешняй альбо ўнутранай палітыцы.

## ШТО КАЖА ЗАКОН?

Трэба адзначыць, што сфера сацыялогіі, як галіна, непасрэдна звязаная з нацыянальнай бяспекай краіны, падрабязна рэгламентуецца і рэгулюецца айчынным заканадаўствам. Згодна з Пастановай Савета Міністраў ад 31 мая 2002 года № 707, усе структуры, зацікаўленыя ў правядзенні сацыялагічных апытанняў, што датычаца сацыяльна-палітычнай сітуацыі, мусяць праходзіць адпаведную акрэдытацыю ў Камісіі па апытаннях грамадскай думкі пры Нацыянальнай акадэміі навук. Такім чынам, дзейнасць арганізацый, што не маюць такой акрэдытацыі, з'яўляецца незаконнай, а ў чэрвені 2012 года Палата прадстаўнікоў прыняла адпаведныя папраўкі ў Адміністрацыйны кодэкс, дапоўніўшы яго артыкулам, што прадугледжвае адказнасць у выглядзе штрафу для фізічных і юрыдычных асоб, якія ажыццяўляюць даследаванні і публікацыю вынікаў апытанняў грамадскай думкі без неабходнай акрэдытацыі.

Зразумела, што такія захады былі выкліканы перш за ўсё неабходнасцю дзяржаўнага кантролю такой важнай дзейнасці, як сацыялагічныя даследаванні, што, безумоўна, патрабуе адпаведнай кваліфікацыі і прафесіяналізму ад выканаўцаў і арганізатараў сацыялагічных цэнтраў. У такіх умовах дзяржаўны экзамен на адпаведнасць уласных магчымасцяў заяўленай сферы дзейнасці вытрымалі толькі сапраўды моцныя структуры, што валодаюць яснымі крыніцамі фінансавання і маюць кваліфікаваны штат супрацоўнікаў. Напрыклад, падобным чынам былі акрэдытаваны Інстытут сацыялогіі НАН, Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ, Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта, а таксама шэраг прыватных установ з недзяржаўным фінансаваннем.

## ХТО НЕ ПРАЙШОЎ ТЭСТ НА «ЧЫСТЫЯ РУКІ»?

Іншыя арганізацыі вымушаны былі прыпыніць легальную дзейнасць і, думаецца, што праблема была не столькі ў тым, што нестае падрыхтаваных сацыёлагаў (адпаведныя кафедры беларускіх ВНУ выпускаюць дастаткова спецыялістаў), колькі ў тым, што згодна з Пастановай Саўміна, **«юрыдычная асоба, што праводзіць апытанні, мусіць падаць пісьмовую інфармацыю пра заказчыкаў і крыніцы фінансавання даследавання».**

Менавіта гэтае патрабаванне чыстай бухгалтэрыі, а таксама абнародавання інфармацыі пра заказчыкаў змусіла шэраг сацыялагічных «лабараторый» і «інстытутаў» пакінуць межы прававога поля і разгарнуць інфармацыйную кампанію аб тым, што «ў Беларусі забараняюць сацыялогію». Відавочна, што інфармацыя аб заказчыках і сродках фінансавання (асабліва калі гэта замежныя структуры і замежныя грошы) пэўным чынам паўплывала б на давер насельніцтва да розных сацыялагічных звестак і моцна знізіла б эфект «даследаванняў» як тэхналогіі маніпуляцыі грамадскай думкай. Таму арганізатарамі і спонсарамі «незалежных цэнтраў» было знойдзена яскрае, на іх думку, выйсце: абыходзячы беларускае заканадаўства, некаторыя сацыялагічныя арганізацыі былі зарэгістраваны за мяжой і нібыта адтуль праводзяць сваю дзейнасць па вывучэнні грамадскіх працэсаў на Беларусі ў «падпольных умовах».

## ЦІ ВАРТЫЯ ДАВЕРУ ЗАМЕЖНЫЯ «НЕЗАЛЕЖНЫЯ ІНСТЫТУТЫ»?

Сімптаматычна, што публікацыя вынікаў «падпольных даследаванняў» аб зніжэнні/павышэнні рэйтынгаў беларускіх палітыкаў, стаўленні жыхароў рэспублікі да знешнепалітычных ініцыятыў кіраўніцтва і дзеянняў глабальных геапалітычных гульцоў дзіўным чынам супадае са зменамі сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне, пачаткам выбарчых кампаній, значнымі падзеямі міжнароднай палітыкі. Застаецца толькі зайздросціць таму, наколькі аператыўна працуе «сетка апытання» гэтых «незалежных інстытутаў» і наколькі якасна сфарміравана так званая «рэпрэзентатыўная выбарка», што дазваляе ахапіць даследаваннем усе слаі насельніцтва.

Між тым аўтарытэтная ў сацыялагічных навуковых колах асоба, дырэктар ІАЦ пры Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксей Дзербін, лічыць, што «правядзенне рэспубліканскага апытання — вельмі складаны працэс, які патрабуе вялікай колькасці інтэрв'юераў па ўсёй краіне, а значыць, арганізаваць яго з-за мяжы практычна немагчыма».

Такая сітуацыя ў сукупнасці з тым фактам, што з 2012 года адпаведны артыкул КААП аб адказнасці за правядзенне сацыялагічных апытанняў без адпаведнай акрэдытацыі амаль не прымяняўся, прымушае сумнявацца не толькі ў дакладнасці вынікаў і якасці даследаванняў, а агулам у тым, што іх правядзенне на тэрыторыі нашай краіны мае месца быць.

Выглядае дзіўна, што ў досыць спакойнай і законапаслухмянай Беларусі, дзе эфектыўна працуе праваахоўны апарат, незарэгістраванымі замежнымі арганізацыямі ў парушэнне дзейнага заканадаўства сістэматычна праводзяцца масавыя апытанні грамадзян па розных аспектах сацыяльна-палітычнай праблематыкі. Гэта яшчэ пры ўсім тым, што, акрамя людской масы, патрэбна адпаведная інфраструктура: спецыялізаванае памяшканне, апаратура відэагуказапісу і г.д.

Думаецца, што звесткі тых «апытанняў» малююцца проста на каленцы ў офісах замежных фондаў ці ў рэстарацыях суседніх сталіц, а ў інфармацыйную прастору нашага грамадства трапляюць у якасці абсалютна асэнсаванай «дэзы» з загадзя прадуманымі мэтамі дэстабілізацыі ўнутрыпалітычнага становішча, падрыву міжнароднага даверу, распаўсюджання інтрыг і плётак сярод супрацоўнікаў дзяржаўнага апарату.

## ЯК ЗАХАВАЦЬ СВЯДОМАСЦЬ?

Збольшага апалітычнае беларускае грамадства доўгі час аберагалася дзяржавай ад уздзеяння падобных «чорных» паліттэхналогій, але з развіццём інтэрнэту распаўсюджанне дэструктыўнай інфармацыі стала больш магчымым. Наіўнаму ў пытаннях палітыкі звычайнаму грамадзяніну трэба навучыцца выбіраць адпаведны інфармацыйны прадукт, нібы на спажывецкім рынку, давяраючы толькі тым звесткам, што маюць адпаведныя законам адзнакі якасці, інакш можна проста надоўга атруціць хлуснёй уласную свядомасць і апынуцца ў выдуманай карціне свету, сфарміраванай прафесійнымі палітычнымі маніпулятарамі.

**Аляксандр ШПАКОЎСКІ**

■

# АДКАЗНАСЦЬ ЗА СВАЁ СЛОВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

За два і больш пісьмовыя папярэджанні на працягу года прадугледжваецца абмежаванне доступу да гэтага рэсурсу. Міністэрства інфармацыі таксама мае права абмяжоўваць доступ да сайтаў, калі яны будуць размяшчаць інфармацыю з заклікамі да звяржэння канстытуцыйнага ладу, экстрэмісцкай дзейнасці, якая прапагандуе вайну, распальванне сацыяльнай варожасці, парнаграфію, культ гвалту і жорсткасці, гандаль наркотыкамі і іншую інфармацыю, распаўсюджванне якой можа нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам Беларусі.

***— У апошнія гады шмат гаворыцца, у тым ліку і на медыя-форумах розных узроўняў, пра безадказнасць у блогах, сацыяльных сетках і на іншых віртуальных пляцоўках. Але ж наколькі рэальна на практыцы пасля ўступлення ў сілу паправак у закон навесці парадак у інтэрнэце?***

— Пры распрацоўцы законапраекта, а працэс гэты доўжыўся даволі працяглы перыяд (яшчэ у 2008 годзе законам аб СМІ прадугледжвалася, што парадак рэгістрацыі інтэрнэт-СМІ будзе зацверджаны Саветам Міністраў), дэталёва вывучаўся замежны вопыт рэгулявання распаўсюджвання інфармацыі праз інтэрнэт. І заходнія краіны, і краіны-суседзі, і краіны паўднёва-ўсходняга азіяцкага рэгіёна заканадаўча прадугледжваюць адказнасць за распаўсюджванне праз сеціва інфармацыі дэструктыўнага кшталту. У прыватнасці, у Вялікабрытаніі за парушэнне журналісцкай этыкі ў інтэрнэце ўстаноўлены штрафныя санкцыі да аднаго мільёна фунтаў стэрлінгаў. У Германіі закон аб інтэрнэт-СМІ змяшчае ключавыя нормы, якія рэгулююць пытанні адказнасці ўладальнікаў сайтаў за супрацьзаконны кантэнт. Францыя яшчэ ў 2000 годзе прыняла закон аб абавязковай рэгістрацыі ўладальнікаў ўсіх вэб-сайтаў і аб крымінальнай адказнасці правайдараў за прадастаўленне хостынгу ў абыход заканадаўства. У Кітаі сайты, якія змяшчаюць забароненую інфармацыю, блакуюцца без якіх-небудзь папярэджанняў і апавяшчэнняў. А ў жніўні мінулага года ў Расіі ўступіў у сілу так званы закон аб блогерах. Ён тычыцца ўладальнікаў інтэрнэт-старонак, якія штодня наведваюць больш за тры тысячы чалавек. Такія блогеры абавязаны правяраць дакладнасць інфармацыі, якую размяшчаюць, не распаўсюджваць звесткі аб прыватным жыцці і экстрэмісцкія матэрыялы. За парушэнне пагражае штраф да 500 тысяч рублёў. Як бачыце, кожная краіна ў той ці іншай ступені заканадаўча рэгулюе глабальнае сеціва. Гэта дазваляе забяспечыць абарону ад дэструктыўных праяў у інтэрнэт-прасторы. Лічу, што і ў Беларусі людзі, якія распаўсюджваюць інфармацыю ў інтэрнэце, у тым ліку і блогеры, павінны адказваць за свае словы. Асабліва сёння, калі інтэрнэт стаў у тым ліку інструментам інфармацыйных войнаў, актыўна выкарыстоўваецца ў крымінальных мэтах, дзяржава павінна мець дзейсны ўплыў на інтэрнэт-рэсурсы. Шчыра прызнацца, вельмі дзіўна чытаць на старонках пэўных выданняў пра «зачыстку» інтэрнэту. На мой погляд, мы ўсе павінны быць зацікаўлены ў сцвярджэнні аб'ектыўнасці ў інтэрнэце, нераспаўсюджванні інфармацыі, якая супярэчыць нацыянальным інтарэсам. Дарэчы, змены ў інтэрнэт-заканадаўстве знайшлі станоўчы водгук у грамадстве. У міністэрства звяртаюцца грамадзяне, якія падтрымліваюць крокі дзяржавы ў гэтым кірунку. Прычым прыводзяцца канкрэтныя факты, на якія неабходна звярнуць увагу. Кожны такі зварот уважліва разглядаецца. І справа тут не ў абмежаванні свабоды слова, а ў недапушчальнасці злоўжывання такой свабодай. Дарэчы, у поўнай адпаведнасці з заканадаўствам 14 студзеня загадам міністра інфармацыі абмежаваны доступ да пяці інтэрнэт-рэсурсаў, якія выкарыстоўваліся для прапаганды і гандлю наркотыкамі. І міністэрства забяспечыць дзейсны кантроль за інтэрнэт-рэсурсамі.

***— Колькі папярэджанняў у адрас сродкаў масавай інфармацыі вынесена Міністэрствам за мінулы год?***

— Парадку 40, прычым большасць з іх не цягне за сабой сур'ёзных наступстваў. Толькі некаторыя з іх звязаны са з'яўленнем у СМІ недакладнай інфармацыі. Разам з тым у Міністэрства інфармацыі паступала вельмі шмат лістоў, зваротаў ад грамадзян, арганізацый, органаў дзяржкіравання, якія сведчаць пра тое, што ў інтэрнэце часта размяшчаецца недакладная інфармацыя, якая зневажае гонар і годнасць. Мамы, у сваю чаргу, занепакоены тым, што дзеці знаходзяць там непатрэбныя для іх узросту матэрыялы ў адкрытым доступе. І ўсе гэтыя гады мы вымушаны былі адказваць: інтэрнэт не з'яўляецца сродкам масавай інфармацыі. З прыняццем паправак у закон сітуацыя зменена карэнным чынам. Усе гэтыя факты разглядаем, адсочваем, даём прынцыповую ацэнку ў рамках сваіх паўнамоцтваў і далей будзем працягваць гэта рабіць. Нельга дапусціць, каб адны інтэрнэт-карыстальнікі абражалі іншых і заставаліся пры гэтым беспакаранымі. Разам з тым, што датычыцца СМІ, ёсць выпадкі, калі рашэнні міністэрства абскарджваюцца ў судовым парадку. І гэта нармальны прававы працэс. З 40 папярэджанняў, вынесеных за мінулы год, толькі па адным цяпер ідзе судовы разгляд. Каб не ўплываць на ход разбору, не хацелася б агучваць падрабязнасці, чым, дарэчы, актыўна карыстаюцца нашы апаненты. Магчыма, паўтаруся, але праз СМІ павінна распаўсюджвацца дакладная інфармацыя. Тым больш па значных для грамадства тэмах. Журналіст, рэдакцыя валодаюць дастатковымі магчымасцямі, каб правяраць інфармацыю. Менавіта гэтага патрабуе закон аб СМІ. А ў асобных выпадках было б варта змяшчаць інфармацыю з першакрыніц.

***— А цяпер хацелася б перайсці да іншай тэмы — пагаварыць пра медыяхолдынгі. Ці можна ўжо сёння назваць плюсы і мінусы, а таксама эканамічны эфект ад іх дзейнасці?***

— Плюсы аб'яднання нацыянальных СМІ сёння відавочныя. У прыватнасці, мы бачым, што газеты набылі новы твар, перасталі дубляваць адна адну, размяшчаць на сваіх старонках адны і тыя ж фотаздымкі, навіны. «Рэспубліка» ў большай ступені стала ўрадавым веснікам, «Сельская газета» цяпер піша не толькі пра сельскую гаспадарку, але і на іншыя тэмы, якія хвалююць вяскоўца. Яшчэ ў пошуку свайго творчага аблічча, як мне здаецца, «Знамя юности». «Народная газета» ператварылася ў буйны і цікавы штотыднёвік, «СБ. Беларусь сегодня» па-ранейшаму ўпэўнена трымае планку галоўнай грамадска-палітычнай газеты краіны. На базе Выдавецкага дома «Звязда», у сваю чаргу, створаны не толькі цэнтр перыядычнага друку культуралагічнай накіраванасці, але і выдавецтва шмат кніг на беларускай мове. Цікавым мне здаецца досвед «Звязды», газеты з багатымі традыцыямі, якая, адзіная ў рэспубліцы, выпускае дадатак «Союз Евразия». Гэта, на мой погляд, запатрабаваны на перспектыву інфармацыйны праект. Безумоўна, з пашырэннем эканамічных узаемаадносін у межах Еўразійскага эканамічнага саюза цікавасць да гэтай тэматыкі будзе павялічвацца. Калі ж казаць пра эканамічны эфект, то газета «Звязда» выйшла на самаакупнасць, холдынг «СБ. Беларусь сегодня» не карыстаўся дзяржаўнымі датацыямі.

***— Газеты саступаюць у аператыўнасці тэлеканалам, радыё, інтэрнэт-выданням. Якія крокі варта зрабіць, каб захаваць наклады друкаваных СМІ?***

— Сапраўды, у эпоху інтэрнэту для друкаваных СМІ наступіла пара пераасэнсаваць эфектыўнасць сваёй дзейнасці. За чытача трэба змагацца. Вядома ж, галоўнае ў гэтай творчай барацьбе — змястоўны кантэнт выданняў. Газета, як і часопіс, — гэта прадукт, які чытач кожны дзень добраахвотна ўпускае ў свой дом. І, паверце, яго нельга падмануць. Калі чалавек адзін раз купіў вашу газету (ці падпісаўся) і яму не камфортна з тым інфармацыйным прадуктам, які вы прапануеце, то другі раз ён выбера нешта іншае. Важна, вядома, каб інфармацыя была прыгожа пададзена, але толькі добрай вёрсткі і дызайну недастаткова. Газета павінна, у першую чаргу, прыцягваць альбо сваёй тэмай, альбо глыбінёй падачы, аналітыкай, якая мусіць прысутнічаць на старонках друкаванага выдання. Тэлебачанне, радыё, газета, у адрозненне ад, як правіла, безаблічнага і распешлівага інтэрнэту, заўсёды аўтарскія. Чаму мы калісьці глядзелі «Клуб падарожнікаў»? Таму што не ўяўлялі яго без Юрыя Сянкевіча. Любілі радыёпастаноўкі, таму што там гучалі галасы тых, каго хацелася слухаць. Чакаем свежы нумар «СБ. Беларусь сегодня» ці «Звязды», бо ведаем, што рана ці позна там з'явіцца артыкул журналіста, думка якога для нас не абыякавая. Поспех, як мне здаецца, у большай адраснасці працы рэдакцыі, якая павінна быць жывым арганізмам, пастаянна працаваць над сваім тварам, адчуваць, што трэба чытачам. Тады і інфармацыйны прадукт, які яна стварае, будзе жывым, цёплым і запатрабаваным.

***— Наконт падпіскі існуюць розныя меркаванні. Некаторыя лічаць, што гэта архаізм, ад якога прыйшоў час адмовіцца... Хацелася б даведацца вашу пазіцыю.***

— Падпіска — гэта сусветная практыка распаўсюджвання перыёдыкі. Лічу, што не варта прыспешваць час і адмаўляцца ад яе. Тыя формы і метады, якія мы паспяхова ўжывалі ў мінулым, павінны захоўвацца, нягледзячы на новыя тэхналогіі. Больш за тое, новыя тэхналогіі трэба ўкараняць і ў саму працэдуру падпіскі. Напрыклад, мы завяршылі распрацоўку інтэрнэт-партала БелСМІ.by, які перадалі медыяхолдынгу «СБ. Беларусь сегодня». Спадзяёмся, што ўжо да канца лютага маштабна прадставім новы праект. Фактычна гэта будзе вялікая электронная пляцоўка, якая прапануе не толькі доступ да ўсіх нацыянальных СМІ, але і цэлы комплекс сучасных паслуг для карыстальніка. Можна будзе афармляць падпіску па інтэрнэце, мець зносіны з аўтарамі, якія зарэгіструюць сябе там як блогеры.

Сёння любы СМІ, зарэгістраваны ў друкаваным выглядзе, не можа разлічваць на поспех, калі не мае інтэрнэт-версіі. Сайт у інтэрнэце патрэбен для таго, каб больш цесна падтрымліваць сувязь з падпісчыкамі. Менавіта там чытач даведаецца, што заўтра будзе ў газеце, прачытае нейкую «гарачую» навіну. У той жа час толькі ў газеце ён зможа прачытаць цікавы каментар, аналітычны артыкул. Каб захаваць падпіску, трэба ўмела вар'іраваць друкаванай і інтэрнэт-версіямі.

**За чытача трэба змагацца. Вядома ж, галоўнае ў гэтай творчай барацьбе — змястоўны кантэнт выданняў. Газета, як і часопіс, — гэта прадукт, які чытач кожны дзень добраахвотна ўпускае ў свой дом. І, паверце, яго нельга падмануць.**

***— Магчыма, будучыня за мультымедыйнымі выданнямі, якія не толькі маюць старонку ў інтэрнэце, але і пашыраюць свой фармат да тэле- і радыёэфіру?***

— Я не думаю, што кожная газета павінна мець сваё радыё і тэлебачанне. Развівацца ў гэтым кірунку могуць, на мой погляд, такія буйныя кампаніі, як «СБ. Беларусь сегодня», Выдавецкі дом «Звязда». Дапусцім, холдынг «СБ. Беларусь сегодня» цяпер з'яўляецца ўладальнікам «Альфа радыё». У нас вельмі традыцыйна аднолькавы эфір FM-станцый. А вось чагосьці такога незвычайнага, з добрым каментаром, суразмоўцам, не хапае. Менавіта таму, думаю, з нашай задумкі можа атрымацца вельмі цікавы інфармацыйны радыё-праект. Сёння няма перашкод, каб развіваць мультымедыйныя рэсурсы, але, пагадзіцеся, стварыць мала, трэба якасна працаваць і быць запатрабаваным. А стварыць толькі дзеля таго, каб стварыць, — я супраць такога падыходу. Навошта марнаваць грошы?

***— На форуме маладых журналістаў прагучала прапанова, каб Міністэрства інфармацыі прызначала галоўных рэдактараў раённых газет. Маўляў, тады яны не так моцна будуць залежаць ад старшыняў райвыканкамаў, змогуць больш свабодна друкаваць крытычныя матэрыялы... Што вы пра гэта думаеце?***

— Прызначаць рэдактараў павінен працадаўца. У той жа час лічу карысным узгадненне прызначэння і вызвалення галоўных рэдактараў Міністэрствам інфармацыі. Гэта трэба зрабіць не столькі для большай свабоды рэдактараў, а для таго, каб кожны кіраўнік СМІ ў большай ступені разумеў сваю адказнасць за агульны інфармацыйны поспех. Кадравы рэестр дазволіць максімальна ўлічваць творчы патэнцыял рэдакцый. Мы лепш зможам бачыць, як растуць нашы кадры, спрыяць таму, каб у рэдакцыях не было застою. Можа, таго, хто прапрацаваў 10 гадоў у Гродна, трэба ў Брэст накіраваць, ці наадварот. Узгадненне таксама садзейнічала б больш дэталёваму разгляду прычын, якія прыводзяць да звальнення галоўных рэдактараў. Але на самой справе я перакананa, што праблемы, якую вы агучылі, няма. За гэтым, я лічу, проста хаваюцца нядобрасумленныя рэдактары. Прывядзіце мне хоць адзін прыклад, калі журналіст падрыхтаваў аб'ектыўны крытычны матэрыял, а яму старшыня райвыканкама не дазволіў яго надрукаваць. Той, хто напісаў якасны тэкст, ніколі ад яго не адмовіцца. Не гэта з'яўляецца перашкодай для таго, каб раёнкі былі цікавымі, якаснымі і запатрабаванымі.

***— Кажуць, як карабель назавеш, так ён і паплыве. Але, як вы ўжо адзначылі, менавіта ад журналісцкага калектыву залежыць, будуць чытаць яго прадукт або аддадуць перавагу іншаму СМІ. Якая роля тут адводзіцца галоўнаму рэдактару? І якія кадры вам, як міністру, хацелася б бачыць у рэдакцыйных калектывах?***

— У кіраўніка СМІ, як і ў яго працаўнікоў, павінны «гарэць» вочы. Калектыў павінен быць у пошуку, пастаянным руху. Калі ў журналіста, роўна як і ў кіраўніка, знікае жаданне прыўнесці нешта цікавае на старонкі газеты, на тэлеканал, у радыёэфір, то пачынаецца застой. Таму люблю людзей, якім у сутках не хапае 25-й гадзіны. Мне здаецца, у журналістыцы гэта адзін з самых галоўных складнікаў поспеху. Усё астатняе — адказнасць, прыстойнасць — гэта само сабой зразумела.

***— Лілія Станіславаўна, пагадзіцеся, поспех у любой справе ў вялікай ступені залежыць ад правільна расстаўленых прыярытэтаў. Якія першачарговыя задачы ставіцца перад галіной на 2015 год? І якой вам, як Міністру інфармацыі, бачыцца бліжэйшая перспектыва ў развіцці СМІ?***

— Летась мы ўважліва вывучылі пытанні, звязаныя з развіццём рэгіянальнага радыёвяшчання ў рэспубліцы, правялі маштабную нараду з гэтай нагоды. Правадное радыё, што хаваць, стала архаічным. Разам з тым вельмі важна на шляху пераходу да новых тэхналогій не страціць радыйнае інфармацыйнае поле. Таму пастаўлена задача на працягу першага квартала распрацаваць рэспубліканскую комплексную праграму развіцця радыёвяшчання ў рэспубліцы да 2020 года. Трэба вызначыцца, як у кожным рэгіёне будзе развівацца рэгіянальнае радыё. І тут варта ўлічыць цікавы досвед працы Мінскай і Гродзенскай абласцей. 2015 год будзе знакавым і для развіцця тэлебачання. Да другога паўгоддзя практычна цалкам краіна пяройдзе з аналагавага вяшчання на лічбавае. Гэта зусім новыя магчымасці, у першую чаргу, для рэгіянальных тэлеканалаў.

2015 год — год 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, у нашай краіне ён аб'яўлены яшчэ і Годам моладзі. У сувязі з гэтым чарговы раз хочацца звярнуцца да журналістаў. Тэма патрыятызму не павінна абмяжоўвацца толькі падрыхтоўкай публікацый да пэўных дат; гэта, на мой погляд, стрыжнёвая тэма для кожнага СМІ. Бо місія нацыянальнай журналістыкі — садзейнічаць развіццю сваёй краіны, свайго народа. Інфармацыйныя войны працягваюць бушаваць каля нашых межаў. І вельмі няпроста, назіраючы за падзеямі, якія адбываюцца ў суседзяў, заставацца аб'ектыўнымі; не руйнаваць, а працаваць на стварэнне. На шчасце, большасць нацыянальных медыя ўсведамляюць сваю адказнасць за лёс Айчыны. І гэта не проста высокія словы. Беларусь была і застаецца краінай дыялогу, міру і ўзаемаразумення.

**Надзея ДРЫЛА.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Цэны

# ПАКУЛЬ БЕЗ ЗМЕН

**Рознічныя цэны на сацыяльна значныя харчовыя прадукты ў студзені, нават у параўнанні са снежнем мінулага года, застаюцца без змен, паведаміла карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка ўпраўлення антыманапольнай і цэнавай палітыкі Гродзенскага аблвыканкама Вольга КАРОТКАЯ.**

Гэта тычыцца хлебабулачных вырабаў, малака, мяса, смятаны, тварагу, масла, плодаагародніннай прадукцыі, алею, яек... Ні вытворцы (у асноўным гэта прадпрыемствы Гродзеншчыны), ні гандаль цэны ў бок павышэння не мянялі. Больш за тое, некаторыя з іх праводзілі перадсвяточныя акцыі з цэнавымі зніжкамі.

Кошт у гандлёвых аб'ектах, напрыклад, мяса птушкі (кураня-бройлер) цяпер, як і раней, складае 28 550 — 32 100 рублёў за 1 кілаграм. Свініна на костцы каштуе каля 59 тыс. руб. Дзясятак яек першай катэгорыі — ад 12 да 16,5 тыс. руб. Не змяніліся з пачатку студзеня і цэны на агародніну (бульбу, моркву, буракі), якая рэалізуецца са стабілізацыйных фондаў і закупляецца ў насельніцтва.

Пры гэтым вытворцы не скарацілі асартымент сваёй прадукцыі — у пакупніка ёсць выбар у адпаведных цэнавых сегментах. Што можна бачыць, напрыклад, па наяўнасці ў продажы малака розных тлустасці. Недахопу прадукцыі і, адпаведна, жадання спекулятыўна на гэтым зарабіць у перадсвяточныя дні і пазней праверкамі не выяўлена, зазначае Вольга Кароткая.

Як пераканаўся аўтар гэтых радкоў, на Цэнтральным рынку абласнога цэнтра цэны на сацыяльна значныя прадукты харчавання таксама не падскочылі. У прыватнасці, за 12 тысяч рублёў я купіў дзясятак яек. Кілаграм бульбы каштаваў 3-5 тысяч рублёў, прыкладна па такой жа цане можна было купіць капусту і моркву. За кілаграм свініны (шыйная частка) прасілі 88-90 тысяч рублёў — гэта танней, чым у многіх крамах. Прычым прапанова мясной прадукцыі, як падалося, перавышае попыт на яе. Праходзячы каля прылаўкаў, амаль ад кожнага гандляра чуеш прапанову спыніцца і купіць менавіта ў яго.

— Цэны «стаяць на месцы»? — цікаўлюся ў адной з гандлярак.

— Прадукцыя свежая і яе трэба хутка прадаць. Таму які нам сэнс падымаць цэны? — пытаннем на пытанне адказвае жанчына.

І сапраўды, ніякай рацыі гэта рабіць няма, тым больш што святы прайшлі і пакупніцкі попыт на тое ж мяса, натуральна, скараціўся.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Май на ўвазе!

# Метро «прыпыніла» рух трамваяў

**З 1 лютага і прыкладна да 10 чэрвеня ў сталіцы закрываецца трамвайны рух па вуліцах Ульянаўскай і Бабруйскай. Прычына — выкананне работ па пераносе інжынерных сетак у сувязі з будаўніцтвам трэцяй лініі метрапалітэна. На некалькі месяцаў, такім чынам, будзе адменена праца трамвайных маршрутаў №№1, 2, 4, 7.**

Адначасова, як паведамілі ў дзяржаўнай установе «Сталічны транспарт і сувязь», будзе прадугледжана істотнае павелічэнне колькасці рухомага саставу на трамвайных маршрутах №№3, 6, 11. Трамвайны маршрут №11 будзе працаваць цэлы дзень і штодзённа.

Таксама з мэтай кампенсацыі знятых трамвайных маршрутаў арганізуецца праца часовага аўтобуснага №901 «ДС «Дружная» — З. Бядулі» са следаваннем па вуліцы Талстога, плошчы Мяснікова, вуліцах Бабруйскай, Ульянаўскай, Першамайскай, З. Бядулі. Інтэрвалы руху гэтага маршруту: 3-4 хвіліны ў гадзіны «пік», 6-7 хвілін у міжпікавы час і па выхадных днях. Здзяйсняць перасадку на трамваі маршрутаў №№3, 6 можна на прыпыначным пункце «З. Бядулі».

Транспартнікі просяць пасажыраў улічваць гэтую інфармацыю пры набыцці праязных білетаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Шпацыр па Камароўцы

# КУПІЦЬ ГРЫБОЎ НА МІЛЬЁН

## А наколькі патаннелі мандарыны?




**Напачатку традыцыйна завітваем на мясныя рады. Кумпяк ялавічыны прапануюць па цане ад 120 да 150 тысяч, філе — за 140. Такія ж цэннікі былі і ў снежні. Язык ёсць па 150 тысяч за кіло, а катлетны фарш з ялавічыны і свініны — за 60—65 тысяч рублёў. Сыравэнджаная каўбаса каштуе да 190 тысяч. Цялячы кумпяк абыдзецца ў 180—200 тысяч за кілаграм, свіны выйдзе ў два разы танней — 95 тысяч. Па тым жа кошце можна набыць і кіло бужаніны альбо барановых рэбраў. Свіная пячонка каштуе 27 тысяч, а вушы — 43 тысячы за кілаграм. За кілаграм бройлерных курантят просяць 26—34 тысячы. Курынае філе каштуе ў два разы больш, кіло крылцаў аддаюць за 26 тысяч, а фаршу — за 60 тысяч.**

Мінулы раз мы доўга шукалі добрую паляндвіцу па сярэднім кошце, які склаў 170 тысяч. Цяпер лічба змянілася — танней за 180 тысяч гэты прадукт не знайсці. 190 тысяч, 200, 210 — менавіта такія цэннікі сярэднія кошты.

Цэннікі на сала таксама крыху падраслі: несалёнае ёсць і па 65, і па 85 тысяч за кілаграм. А добра прыпраўленае «Сялянскае» аблегчыць кашалёк на суму ад 110 да 140 тысяч рублёў за кілаграм.

Прайшліся і па радах з замарожанай рыбай. Кіло скумбрыі тут — 30 тысяч, мойвы — 41 тысяча. Рачны шчупак ідзе за 50 тысяч, хек — за 65. Яшчэ даражэй атрымаецца набыць гарбушу — на цэнніку пазначана 79 тысяч, а кілаграм вэнджанай выбыходзіць за 110 тысяч. Далікатэсы, вядома, уляцяць у капеечку: так, кілаграм філе сёмгі прапануюць за 270 тысяч, такі ж на вазе кавалак стронгі — за 260 тысяч.

Далей паглядзім, што цікавага заморскага ёсць на Камароўцы. Аранжавая хурма — па самым розным кошце. Значна больш танную хакі — у наяўнасці і за 14, і за 20, і за 26 тысяч за кілаграм. Шакаладны каралёк прапануюць і па 14, і нават па 10 тысяч. Мандарынаў таксама шмат, на любы густ: хочаш — дробныя, хочаш — буйныя. Адпаведна адрозніваюцца і кошты — ад 18 да 25 тысяч рублёў за кілаграм. Гэта крыху танней, чым было ў снежні — тады цэннік вагаўся ад 18 да 40 тысяч. Апельсіны ў сярэднім можна набыць за 20 тысяч ці крыху больш, лімоны — ад 25 да 30 тысяч рублёў за кілаграм. А вось на прылаўку з лаймам красуецца цэннік 130 тысяч за кілаграм. Кошты на гранаты мяняюцца ў адпаведнасці з памерам — сярэднія можна адшукаць за 35, а вялікія ёсць і па 50 тысяч за кілаграм. Бананы ў сярэднім каштуюць 18—20 тысяч, хоць знайшліся і па 10 тысяч. З'явіліся і новыя цікавыя «прышэльцы», напрыклад, сунічныя ківі з Італіі альбо ізраільскі грэйпфрут. Гэтыя плады адгукаюць па кошце 35—40 тысяч за кілаграм. Жоўты сірыйскі грэйпфрут каштуе значна менш — усяго 12 тысяч за кілаграм.

Памідоры гатунку «Чорны прынц» трымаюць «планку» — за кілаграм просяць не менш за 55 тысяч. Цікава, што маладыя кабачкі ідуць па тым жа кошце. Сярэднія расцэнкі для беларускіх таматаў — 28 тысяч рублёў за кілаграм, хоць і выглядаюць яны не надта апетытна: вадзяністыя і бляклыя (у снежні кіло айчынных выходзіла ў сярэднім па 20 тысяч). Херсонскія ёсць і па 30, а на галінцы — па 46 тысяч за кілаграм.

Цэны на айчынныя яблыкі амаль не змяніліся: «Ананасныя», «Лігольь», «Ліза» захавалі ранейшы кошт у 12 тысяч за кілаграм. Для параўнання: малдаўскія яблыкі ідуць па 8 тысяч за кілаграм. З беларускіх гатункаў па такім кошце можна знайсці хіба антонаўкі. Груша «Бэра мядовая» каштуе 22 тысячы за кілаграм, а «Канфярэнцыя» — 25—27 тысяч.

Напрыканцы мне прапанавалі паласавацца журавінамі — усяго 65 тысяч за літровы слоік ягад. А побач прадаўшчыца раскладвала сушаныя грыбы, кошт на якія, прызнацца, здзівіў — за паўкілаграма сушаных баравікоў трэба выкласці 750 тысяч — гэта сапраўдны рэкорд!

**Лічыльнік «Звязды»**

*(Цэны за кілаграм, калі не пазначана іншае)*

Айва — 70 тысяч

Ананас — 35 тысяч

Вінаград турэцкі без костачак — 65 тысяч

Морква — 6—7 тысяч

Буракі — 6 тысяч

Бульба — 6—10 тысяч

Чырвоны перац — 34 тысячы

Агуркі — 35—40 тысяч

Пятрушка — 8 тысяч (за 100 грамаў)

Ліставая салата — 12 тысяч

Зялёная цыбуля — 8—10 тысяч (100 грамаў)

Капуста — 7—10 тысяч

Брокалі — 50 тысяч

Баклажаны — 85 тысяч

Квашаная капуста і агуркі — 30 тысяч

Гарбуз мускатны — 15 тысяч

Шампіньёны — 30 тысяч.

**Кацярына РАДЗЮК**

■ Здарэнні

# ВЫБУХ АД... ДЭЗАДАРАНТА

**У нядзелю вечарам жыхарка шматпавярховіка па вуліцы Лімажа ў Гродне патэлефанавала ў МНС.**

Як высветлілася, «віноўнікам» выбуху ў кватэры стаў аэразольны дэзадарант, які знаходзіўся ў спальні. Побач з ім напярэдадні Вадохрышча запаліла свечку, і ніхто з сямейнікаў не мог прадбачыць, што паступовая разгерметызацыя балончыка і запаўненне пакою небяспечнай сумессю высокай канцэнтрацыі ў суседстве з агнём прывядзе да такіх наступстваў. Гарэння не адбылося, аднак выбуховая хваля выбіла шыбы двух аконных праёмаў і міжпакаёвыя дзверы. На шчасце, людзі не пацярпелі, паведамляе прэс-служба Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Надвор'е

# ТУМАН І СЛІЗКІЯ ДАРОГІ

## А ў нядзелю падмарозіць да мінус 15 градусаў

**Сёння пры павышаным фоне атмасфернага ціску ў большасці раёнаў Беларусі істотных ападкаў не будзе, толькі месцамі па поўдні краіны пройдзе снег і мокры снег. У асобных раёнах туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца, паведаміла __спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.__**

Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. У серадзу і чацвер пад уплывам малярухомых атмасферных франтоў часам будзе іс-ці снег. Месцамі чакаюцца туман і галалёдныя з'явы. Тэмпература паветра ўначы на 21 і 22 студзеня будзе ад мінус 6 да плюс 1 градуса, а па паўночным усходзе — да мінус 10 градусаў. Удзень чакаецца ад мінус 6 градусаў па паўночным усходзе да 3 цяпла па паўднёвым захадзе Беларусі.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, напрыканцы тыдня тэрыторыя краіны трапіць пад уплыў ускраіны халоднага антыцыклону з цэнтрам над еўрапейскай часткай Расіі. Таму стане яшчэ халадней. У пятніцу і суботу часам чакаецца невялікі снег. У гэтыя два дні тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 6 градусаў да 1 цяпла, аднак на паўночным усходзе стане ўжо да мінус 12 градусаў. Удзень па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці — да плюс 3 градусаў. Сур'ёзна пахаладае ў нядзелю. Месцамі будзе ісці кароткачасовы снег. Тэмпература паветра на працягу сутак мінус 2-9 градусаў, уначы пры праясненнях на поўначы да 10-15 марозу. А гэта ўжо сапраўдная зіма.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Ну і ну!

# Прадаў... чужы «кінуты» аўтамабіль

**У Маскоўскі РУУС сталіцы паступіла заява аб крадзяжы патрымаманага аўтамабіля «Рэно». Як потым аказалася, адзін прадпрымальны мінчанін палічыў машыну кінутай і... прадаў яе.**

Аўтамабіль доўгі час стаяў на тэрыторыі гаражна-будаўнічага кааператыва ў Маскоўскім раёне. Гаспадар зняў машыну з уліку і выставіў на продаж у інтэрнэце. Нарэшце, аб'явай зацікавіліся. Паколькі транспартны сродак быў не на ходу, уладальнік-прадавец прапанаваў патэнцыяльнаму кліенту самастойна агледзець магчымую пакупку, назваўшы месца, дзе стаіць «Рэно». Аднак пакупнік там нічога не ўбачыў, пра што і паведаміў гаспадару.

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Маскоўскага РУУС высветлілі, што машыну з тэрыторыі кааператыва вывезлі на эвакуатары. Неўзабаве ўстанавілі і асобу таго, хто яго замаўляў. Грамадзянін распавёў, што аўто разам з дакументамі набыў за 200 долараў. Па ўмовах здзелкі, ён павінен быў самастойна забраць машыну са стаянкі. Сышчыкі ўстанавілі і асобу «прадаўца». Высветлілася, што 29-гадовы мінчанін ніякага дачынення да гаспадара машыны не мае. Ён распавёў, што даўно звярнуў увагу на, як ён палічыў, кінуты аўтамабіль, што стаяў з адчыненай дзверцай. І вырашыў яго... прадаць. Цікава, што дакументы на машыну знаходзіліся ў салоне. Дзеянні грамадзяніна разглядаюцца ў рамках крымінальнай справы па факце крадзяжу.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

70 ГОД 1945-2015 Вялікай Перамогі

# «СТОЛ» ДЛЯ САМАЛЁТА

## Легендарны савецкі разведчык правёў адну з удалых аперацый у лесе пад Маларытай

**Узнавіў гэту амаль неверагодную гісторыю, па крупінках сабраў матэрыял пра подзвіг у Мехераўскім лесе кіраўнік школьнага музея, настаўнік Пётр Ківачук. Пакуль жывыя былі байцы партызанскай брыгады Сцяпана Каплуна, яны не раз расказвалі пра тое, як у тыл ворага, у самае пекла, прыляцелі самалёты з-за лініі фронту, як пад абстрэлам немцаў вывозілі нейкіх вельмі важных палякаў, як партызаны ў самым гушчары пад носам у немцаў высякалі пляцоўку для самалётаў.**


Настаўнік Пётр Ківачук.

Пётр Іванавіч супаставіў аповеды былых партызанаў — а гаворка ішла пра лес, які знаходзіцца за восем кіламетраў ад яго роднай вёскі Мельнікі, што ў Маларыцкім раёне — і актыўна заняўся пошукам. Усё, што расказвалі вяскоўцы, паступова знаходзіла пацвярджэнне ў дакументах і літаратуры.

Вось што высветліў сельскі настаўнік. На пачатку студзеня 1944 года ў Варшаве была створана Краёва Рада Нарадова — галоўны орган барацьбы з фашыстамі. Кіраўнікі Рады ўсяляк імкнуліся наладзіць сувязь з урадам СССР. Для вядзення перамоў была прызначана дэлегацыя з чатырох чалавек. Яны з сярэдзіны сакавіка спрабавалі дабрацца ў Маскву, але ніяк не маглі гэта зрабіць. Дэлегаты КРН перадолелі няпросты шлях па акупаванай Польшчы і напачатку красавіка аказаліся ў партызанскай брыгадзе асобага прызначэння, якой камандаваў падпалкоўнік Сцяпан Каплун. Для пераходу праз лінію фронту палякам выдзелілі спецгрупу партызан, але зрабіць гэта пад Ковелем, як планавалі, не атрымалася. Два тыдні група блукала па лясах і балотах і зноў вярнулася ў Мехераўскі лес.

У гэты ж час карнікі пачалі жорсткія баі з каплунаўцамі. Жыццё польскіх дэлегатаў Баляслава Берута, Асубкі Мараўскага, Яна Спыхальскага, Яна Гонемана аказалася ў небяспецы. З Масквы прыйшоў загад: не марудзячы, любымі спосабамі даставіць іх на савецкую тэрыторыю для перамоў пра будучыню Польшчы. Выкананне загаду даручылі разведчыкам. У штабе фронту аперацыю ўзначаліў палкоўнік Мікалай Лявонцьеў. Ён прыняў рашэнне вывезці палякаў самалётамі. Таму Каплуну перадалі тэрміновае ўказанне падрыхтаваць пасадачную пляцоўку для двух самалётаў У-2. А пералёт і дастаўку польскіх таварышаў выпадала ажыццявіць 20-гадоваму, але вопытнаму разведчыку Авідзію Гарчакову, які меў падпольны псеўданім Спартак.

З 24 красавіка партызаны брыгады Каплуна сталі рыхтаваць пасадачную пляцоўку для самалётаў. У лесе, які спакон вякоў тут называюць Мехераўскім, знайшлі паляну ў акружэнні балот. Партызаны пачалі раўняць і павялічваць яе. Давялося пілаваць дрэвы і карчаваць пні, высякаць хмызняк і прыбіраць буралом. Усё рабілася найбольш па начах, бо за тры кіламетры, у вёсцы Ляхаўцы, размяшчаліся войскі дывізіі СС «Вікінг».

У школьным музеі захоўваюцца ўспаміны былога партызана Івана Мірчука. Ён расказваў, у якіх складаных умовах даводзілася працаваць, рыхтуючы пасадачную паласу. Нельга было распальваць вогнішчы, курыць, нават гучна размаўляць. Але ноч за ноччу лясныя байцы, рызыкуючы быць заўважанымі немцамі, ачышчалі паляну. Калі, нарэшце, «стол» — так называлі лётчыкі партызанскі аэрадром — быў гатовы, немцы пачалі наступленне. Партызанам давялося мяняць пазіцыю і адыходзіць глыбей у лес. Потым аперацыю зноў адкладвалі — ужо праз нялётнае надвор'е. А Масква прыспешвала.







▲Былы партызан Іван Мірчук.
Разведчык Авідзій Гарчакоў.▶

Нарэшце, 14 мая 1944 года глухой ноччу з аэрадрома пад Сарнамі падняліся два самалёты У-2. У адным знаходзіўся Авідзій Гарчакоў, у другім — радыстка Валянціна Патупава. Лінію фронту пераадолелі на вялікай вышыні ў раёне Ковеля, а потым узялі курс на Маларыту. У лесе пілоты і Гарчакоў убачылі чатыры маленькія агеньчыкі — гэта і быў умоўны сігнал партызан. Самалёты паспяхова прызямліліся на «стале». І хоць вогнішчы хутка патушылі, немцы пачалі страляць у бок лесу. Усё вырашалі хвіліны. Гарчакоў прыняў рашэнне ўзлятаць. У-2 ледзь не краналі верхавіны дрэў, але ўзлёт, на шчасце, прайшоў нармальна. І ў той жа дзень у Маскве атрымалі паведамленне пра выратаванне польскай дэлегацыі. А літаральна праз два дні Юрый Левітан абвясціў па радыё, што ў Маскву з Польшчы прыбылі дэлегаты КРН. Іх правялі перамовы са Сталіным і паслом ЗША Гарыманам. Гэтыя палякі ў ліпені-жніўні 1944 года ўвайшлі ў першы польскі ўрад.

Даведаўшыся пра лясную аперацыю з дакументаў і расказаў партызан, настаўнік Пётр Ківачук вельмі хацеў сустрэцца з яе арганізатарам. Ён напісаў пісьмо былому разведчыку і атрымаў адказ з Масквы. Ветэран вайны запрашаў у госці не толькі настаўніка, але і яго вучняў. І сустрэча адбылася ў 1982 годзе. Гасцям з Маларыты Авідзій Аляксандравіч расказаў пра сябе. Нарадзіўся ён у 1924 годзе ў Адэсе. Яго бацька працаваў Генконсулам СССР у Вашынгтоне, Лондане, Рыме. Шмат гадоў сям'я Гарчаковых правяла за мяжой. Юны Авідзій дасканала ведаў нямецкую і англійскую мовы. Але ў канцы 30-х гадоў бацьку адклікалі і арыштавалі. Яго абвінавацілі ў шпіянажы і пасадзілі на 20 гадоў. У 1954 годзе Гарчакоў-старэйшы памёр у лагеры, а ў 1957-м яго пасмяротна рэабілітавалі...

**Выкананне загаду даручылі разведчыкам. У штабе фронту аперацыю ўзначаліў палкоўнік Мікалай Лявонцьеў. Ён прыняў рашэнне вывезці палякаў самалётамі.**

У 1941-м Авідзій Гарчакоў, якому не споўнілася і 17, быў залічаны ў разведшколу. Вучыўся там разам з Зояй Касмадзям'янскай. Пасля заканчэння школы стаў разведчыкам, выконваў розныя заданні, не раз бываў у самым пекле. У пасляваенны час працаваў перакладчыкам, скончыў літаратурны інстытут. Напісаў кнігі «Выклікаем агонь на сябе», «Максім не выходзіць на сувязь», «Лебядзіная песня», «Захоўваць вечна». У музеі Мельніцкай школы знаходзяцца яго ўспаміны, здымкі, кнігі.

Заслугі разведчыка Гарчакова перад Польшчай ацэнены найвышэйшым ваенным ордэнам-крыжам «Віртуці-мілітары» і медалём «Братэрства брані». На Радзіме ён узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі. Па яго кнігах зняты фільмы «Парашуты на дрэвах», «Выклікаем агонь на сябе». Падчас сустрэчы з маларытчанамі Авідзій Аляксандравіч сказаў, што пасля аперацыі ў Мехераўскім лесе ён выконваў заданні ў Польшчы, Германіі. І толькі нядаўна Пётр Ківачук даведаўся, што Авідзій Гарчакоў быў адным з прататыпаў героя Юліяна Сямёнава — легендарнага маёра Віхра.

❍❍❍

Школьны музей вёскі Мельнікі працуе тры дзясяцігоддзі. Яго кіраўнік Пётр Іванавіч Ківачук не проста праводзіць экскурсіі для гасцей і ўрокі мужнасці для вучняў школы. Ён вядзе вялікую работу. Школьны настаўнік устанавіў дзясяткі імёнаў землякоў і тых, хто змагаўся на гэтай зямлі. Дзякуючы яго нястомнаму пошуку праведзена перапахаванне многіх савецкіх воінаў, што загінулі ў ваколіцах Мельнікаў. Спатрэбіліся доўгія гады, каб даказаць партызанскае мінулае жыхаркі вёскі Кацярыны Васільеўны Саўчук, якая яшчэ ў маладосці на пажары страціла дакументы. І толькі ў 2011 годзе амаль 90-гадовую Кацярыну Васільеўну афіцыйна прызналі ўдзельнікам вайны — гэта значыць, справядлівасць была адноўлена. А ў канцы мінулага года ў Мельнікі прыязджалі госці аж за пяць з паловай тысяч кіламетраў. У музеі даўно захоўваўся ордэн, які знайшлі на месцы былых баёў. І вось, нарэшце, удалося ўстанавіць імя яго гаспадара. Пакланіцца памяці дзеда з роднымі прыехалі з далёкай Сібіры.

Пётр Ківачук актыўна працуе ў бібліятэках і архівах. У яго даследчыцкім партфелі — не адзін распачаты праект.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Маларыцкі раён*

■ Факт

## Патрыятычная акцыя

**Праект «70 крокаў Вялікай Перамогі» распачаўся ў Ленінскім раёне Брэста. Яго ініцыятары — актывісты і кіраўнікі райкама БРСМ.**

Праект уключае ў сябе валанцёрскую работу з ветэранамі вайны, супрацоўніцтва з ветэранскімі арганізацыямі, а таксама конкурсы плакатаў, фотаздымкаў, творчых работ, мультымедыйных прэзентацый і буклетаў. Таксама запланаваны працы па добраўпарадкаванні тэрыторыі Брэсцкай крэпасці і іншыя працоўныя дэсанты ў мясцінах, звязаных з памяццю пра вайну. Да ўдзелу ў праекце, прысвечаным 70-годдзю перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі, запрашаюцца ўсе ахвотныя.

**Яна СВЕТАВА**

## Міні-Версаль на Астравеччыне

**Падворак Ванды Лосевай з пасёлка Гудагай, упрыгожаны хвойнымі насаджэннямі, каменнымі дворыкамі, «альпійскімі горкамі» і вадаёмамі, стаў пераможцам у намінацыі «Міні-Версаль» агляду-конкурсу «Ветэранскі падворак», які ўжо традыцыйна праходзіць у Астравецкім раёне.**

У намінацыі «Майстар-самаробкін» перамаглі Генрых і Ліна Лапуні з вёскі Чэхі, што вырабляюць розныя прыстасаванні для аблягчэння працы ў гаспадарцы. Яшчэ адзін майстар Станіслаў Памецька з вёскі Варона стаў найлепшым у намінацыі «Ачумелыя ручкі». А Станіслава Мялешка з Астраўца прызнана найлепшым кветкаводам. Гэтых і іншых таленавітых і працавітых пенсіянераў раённая ўлада ўзнагародзіла дыпломамі і каштоўнымі падарункамі ў тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва — з канцэртам, спектаклем у выкананні самадзейных акцёраў і чаяпіццем за «салодкім» сталом.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ
**Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 426162.**

| Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| **Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым № 221289203601000177, площадью 0,1492 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Шапечинский с/с, п. Липовцы, ул. Северная, 24, для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничений в использовании нет. **Начальная цена**: 14 222 850 бел. руб. **Размер задатка:** 1 422 000 бел. руб. |
| **Лот № 2.** Земельный участок с кадастровым № 221289203601000176, площадью 0,1474 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Шапечинский с/с, п. Липовцы, ул. Северная, 26 для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена**: 14 051 200 бел. руб. **Размер задатка:** 1 405 000 бел. руб. |
| **Лот № 3.** Земельный участок с кадастровым № 221281201601000072, площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Дрюково, ул. Центральная, участок № 5, для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: охранная зона линий электропередачи до 1000В. **Начальная цена**: 6 834 300 бел. руб. **Размер задатка:** 683 000 бел. руб. |
| **Лот № 4.** Земельный участок с кадастровым № 221281201601000074, площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Дрюково, ул. Центральная, участок № 6, для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничений в использовании нет. **Начальная цена**: 6 834 300 бел. руб. **Размер задатка:** 683 000 бел. руб. |
| **Лот № 5.** Земельный участок с кадастровым № 221281201601000071, площадью 0,1498 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Дрюково, ул. Центральная, участок № 8, для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги. **Начальная цена**: 6 825 150 бел. руб. **Размер задатка:** 682 000 бел. руб. |
| **Лот № 6.** Земельный участок с кадастровым №221281201601000073, площадью 0,1496 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Дрюково, ул. Центральная, участок № 9, для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги. **Начальная цена**: 6 816 100 бел. руб. **Размер задатка:** 681 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 20.02.2015 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 20.01.2015 с 8.30 по 19.02.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». |

**Реквизиты для внесения задатка по лотам № 1, № 2:** р/с 3600314140154 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк», ул. Смоленская, 9а, МФО 635, УНП 300958583, код платежа 4901, получатель платежа: Шапечинский сельский исполком.

**Реквизиты для внесения задатка по лотам № 3, № 4, № 5, № 6:** р/с 3600314020043 в ф-ле № 200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300972045, код платежа 4901, получатель платежа: Вороновский сельский исполком.

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан – документ, удостоверяющий личность. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; получить в отделе архитектуры и строительства Витебского райисполкома техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем. участка не позднее 1 года после получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации права на него; осуществить строительство жилого дома в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности земельного участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

## ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# АБ УНЯСЕННІ ДАПАЎНЕННЯЎ І ЗМЯНЕННЯЎ У КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ ЗЯМЛІ

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 11 снежня 2014 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 18 снежня 2014 года*

**Артыкул 1.** Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі ад 23 ліпеня 2008 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 187, 2/1522; 2010 г., № 120, 2/1672; Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 25.01.2013, 2/2015; 11.01.2014, 2/2105) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. У артыкуле 1:

абзац дваццаць дзявяты пасля слова «кошту» дапоўніць словам «зямель,»;

пасля абзаца трыццаць сёмага дапоўніць артыкул абзацам наступнага зместу:

«рашэнне аб маючым адбыцца адабранні зямельнага ўчастка для дзяржаўных патрэб і зносе размешчаных на ім аб'ектаў нерухомай маёмасці (далей — рашэнне аб маючым адбыцца адабранні зямельнага ўчастка) — рашэнне дзяржаўнага органа, які ажыццяўляе дзяржаўнае рэгуляванне і кіраванне ў галіне выкарыстання і аховы зямель, аб маючым адбыцца адабранні зямельнага ўчастка для дзяржаўных патрэб і зносе размешчаных на ім аб'ектаў нерухомай маёмасці, што прымаецца ў парадку, вызначаным актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;»;

абзацы трыццаць восьмы — сорак трэці лічыць адпаведна абзацамі трыццаць дзявятым — сорак чацвёртым.

2. У артыкуле 10:

назву артыкула выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 10. Дзяленне, зліццё і змена мэтавага прызначэння зямельных участкаў»;**

частку другую дапоўніць словамі «, а таксама падзел зямельных участкаў, выдзеленых для будаўніцтва (будаўніцтва і абслугоўвання) капітальных збудаванняў (будынкаў), да завяршэння іх будаўніцтва»;

дапоўніць артыкул часткамі чацвёртай і пятай наступнага зместу:

«Змена мэтавага прызначэння зямельных участкаў ажыццяўляецца на падставе адпаведнага рашэння, прынятага дзяржаўным органам, які ажыццяўляе дзяржаўнае рэгуляванне і кіраванне ў галіне выкарыстання і аховы зямель у адпаведнасці з яго кампетэнцыяй, у парадку, вызначаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Не дапускаецца змена мэтавага прызначэння зямельных участкаў, выдзеленых для вядзення асабістай дапаможнай гаспадаркі, а таксама зямельных участкаў, выдзеленых для будаўніцтва (будаўніцтва і абслугоўвання) капітальных збудаванняў (будынкаў), да завяршэння іх будаўніцтва.».

3. Абзац дванаццаты часткі другой артыкула 15 дапоўніць словамі «, за выключэннем выпадкаў будаўніцтва аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу ў прыгарадных зонах г. Мінска і абласных цэнтраў».

4. У артыкуле 17:

у частцы трэцяй словы «і гарадскімі (гарадоў абласнога падпарадкавання)» замяніць словамі «, гарадскімі (гарадоў абласнога, раённага падпарадкавання) і раённымі»;

частку чацвёртую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Грамадзяне, недзяржаўныя юрыдычныя асобы Рэспублікі Беларусь, якія маюць зямельныя ўчасткі ў прыватнай уласнасці, могуць з'яўляцца арэндадаўцамі гэтых зямельных участкаў пры ўмове захавання іх мэтавага прызначэння і з улікам абмежаванняў, устаноўленых гэтым Кодэксам. Передача ў арэнду зямельных участкаў, выдзеленых у прыватную ўласнасць для будаўніцтва капітальных збудаванняў (будынкаў), забараняецца, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, да атрымання іх уласнікамі дакументаў, якія сведчаць права на размешчаныя на гэтых участках капітальныя збудаванні (будынкі).»;

частку дзявятую выключыць;

частку дзясятую лічыць часткай дзявятай.

5. У артыкуле 22:

назву артыкула пасля слоў «звязаных з» дапоўніць словамі «маючым адбыцца адабраннем,»;

тэкст артыкула пасля слова «рашэннях» дапоўніць словамі «аб маючым адбыцца адабранні,».

6. У артыкуле 25:

пасля абзаца шостага дапоўніць артыкул абзацамі наступнага зместу:

«вызначае парадак змены мэтавага прызначэння зямельных участкаў;

вызначае парадак правядзення кадастравай ацэнкі зямель, зямельных участкаў;»;

абзацы сёмы — чатырнаццаты лічыць адпаведна абзацамі дзявятым — шаснаццатым.

7. У частцы першай артыкула 26:

пасля абзаца сёмага дапоўніць частку абзацам наступнага зместу:

«забяспечвае правядзенне кадастравай ацэнкі зямель, зямельных участкаў;»;

абзацы восьмы — адзінаццаты лічыць адпаведна абзацамі дзявятым — дванаццатым;

з абзаца дзявятага словы «, у тым ліку кадастравай ацэнкі зямель, зямельных участкаў» выключыць;

абзац дзясяты пасля слова «кошту» дапоўніць словам «зямель,».

8. У абзацы пятым часткі першай артыкула 27 і абзацы чацвёртым артыкула 30:

словы «ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі» замяніць словамі «з улікам асаблівасцяў, прадугледжаных часткай пятай артыкула 10 гэтага Кодэкса, і ў адпаведнасці з іншымі актамі заканадаўства»;

другі сказ выключыць.

9. У частцы першай артыкула 28:

у абзацы чацвёртым:

словы «ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі» замяніць словамі «з улікам асаблівасцяў, прадугледжаных часткай пятай артыкула 10 гэтага Кодэкса, і ў адпаведнасці з іншымі актамі заканадаўства»;

другі сказ выключыць;

з абзаца дзясятага словы «, за выключэннем выканаўчых камітэтаў гарадоў раённага падпарадкавання,» выключыць.

10. У частцы першай артыкула 29:

у абзацы чацвёртым:

словы «ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі» замяніць словамі «з улікам асаблівасцяў, прадугледжаных часткай пятай артыкула 10 гэтага Кодэкса, і ў адпаведнасці з іншымі актамі заканадаўства»;

другі сказ выключыць;

пасля абзаца дзявятага дапоўніць частку абзацам наступнага зместу:

«могуць дэлегаваць адміністрацыям свабодных эканамічных зон, спецыяльных турысцка-рэкрэацыйных паркаў, органам кіравання якіх з'яўляецца адміністрацыя свабоднай эканамічнай зоны, свае правы па адабранні і выдзяленні ў арэнду рэзідэнтам гэтых зон, паркаў зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў межах свабодных эканамічных зон, спецыяльных турысцка-рэкрэацыйных паркаў, і пры неабходнасці па пераводзе зямельных участкаў з адных катэгорый у іншыя, у тым ліку па падрыхтоўцы праектаў дагавораў арэнды гэтых зямельных участкаў і іх заключэнні;»;

абзацы дзясяты — дванаццаты лічыць адпаведна абзацамі адзінаццатым — трынаццатым.

11. У частцы трэцяй артыкула $31^1$:

абзац сёмы дапоўніць словамі «, за выключэннем выпадкаў будаўніцтва аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу ў прыгарадных зонах г. Мінска і абласных цэнтраў»;

абзац дзявяты дапоўніць словамі «, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь»;

з абзаца дзясятага словы «для дзяржаўных патрэб і зносе размешчаных на ім аб'ектаў нерухомай маёмасці» выключыць;

пасля абзаца трынаццатага дапоўніць частку абзацам наступнага зместу:

«арганізацыям, а таксама індывідуальным прадпрымальнікам, якія ажыццяўляюць збор, сартаванне (падзел па відах), падрыхтоўку да абясшкоджвання і (або) выкарыстання другасных матэрыяльных рэсурсаў, — для размяшчэння прыёмных пунктаў другаснай сыравіны, аб'ектаў сартавання, абясшкоджвання, перапрацоўкі камунальных адходаў і аб'ектаў пахавання цвёрдых камунальных адходаў;»;

абзац чатырнаццаты лічыць абзацам пятнаццатым.

12. У артыкуле 39:

частку першую пасля слоў «дачны кааператыў» дапоўніць словамі «, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь»;

частку другую пасля другога сказа дапоўніць сказам наступнага зместу: «Свабодныя (незанятыя) зямельныя ўчасткі для калектыўнага садоўніцтва, дачнага будаўніцтва, якія размешчаны ў існуючых садоўніцкіх таварыствах, дачных кааператывах і знаходзяцца на тэрыторыі прыгараднай зоны г. Мінска, выдзяляюцца ў вызначаным парадку грамадзянам па выніках аўкцыёнаў па продажу зямельных участкаў у прыватную ўласнасць альбо па выніках аўкцыёнаў на права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў.».

13. Артыкул 47 дапоўніць часткамі трэцяй і чацвёртай наступнага зместу:

«Передача правоў і абавязкаў па дагаворах арэнды зямельных участкаў, выдзеленых для будаўніцтва капітальных збудаванняў (будынкаў), забараняецца, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, да атрымання іх арандатарамі дакументаў, якія сведчаць права на размешчаныя на гэтых участках капітальныя збудаванні (будынкі), за выключэннем передачы правоў і абавязкаў па дагаворах арэнды зямельных участкаў з размешчанымі на іх незавершанымі законсерваванымі капітальнымі збудаваннямі.

У прыгарадных зонах г. Мінска і абласных цэнтраў забараняюцца, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, передача ў арэнду зямельных участкаў, выдзеленых у прыватную ўласнасць для калектыўнага садаводства, передача правоў і абавязкаў па дагаворах арэнды зямельных участкаў, выдзеленых у арэнду для названай мэты, у тым ліку зямельных участкаў, утвораных у выніку іх падзелу, зліцця, да заканчэння пяці гадоў з дня дзяржаўнай рэгістрацыі ўзнікнення правоў на такія зямельныя ўчасткі.».

14. У артыкуле 51:

абзац чацвёрты часткі шостай выключыць;

дапоўніць артыкул часткай дзявятай наступнага зместу:

«У прыгарадных зонах г. Мінска і абласных цэнтраў забараняюцца, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, адчужэнне (купля-продаж, мена, дарэнне) выдзеленых у прыватную ўласнасць для калектыўнага садоўніцтва зямельных участкаў, у тым ліку зямельных участкаў, утвораных у выніку іх падзелу, зліцця, а таксама адчужэнне капітальных збудаванняў (будынкаў), незавершаных законсерваваных капітальных збудаванняў, размешчаных на зямельных участках, выдзеленых для калектыўнага садоўніцтва, у тым ліку на зямельных участках, утвораных у выніку іх падзелу, зліцця, да заканчэння пяці гадоў з дня дзяржаўнай рэгістрацыі ўзнікнення правоў на такія зямельныя ўчасткі, за выключэннем адчужэння зямельных участкаў і (або) размешчаных на іх капітальных збудаванняў (будынкаў), незавершаных законсерваваных капітальных збудаванняў мясцовым выканаўчым камітэтам.».

15. Абзац пяты часткі першай, часткі пятую і сёмую артыкула 84 пасля слова «кошту» дапоўніць словам «зямель,».

16. Абзац восьмы часткі першай артыкула 85 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«ведамасныя справаздачы аб наяўнасці і размеркаванні зямель;».

17. Артыкул 88 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 88. Кадастравая ацэнка зямель, зямельных участкаў**

Кадастравая ацэнка зямель, зямельных участкаў падраздзяляецца на кадастравую ацэнку зямель, зямельных участкаў населеных пунктаў, садоўніцкіх таварыстваў і дачных кааператываў, зямель, зямельных участкаў, размешчаных за межамі населеных пунктаў, садоўніцкіх таварыстваў і дачных кааператываў (далей — кадастравая ацэнка зямель), і кадастравую ацэнку сельскагаспадарчых зямель зямельных участкаў, выдзеленых сельскагаспадарчым арганізацыям, у тым ліку сялянскім (фермерскім) гаспадаркам, іншым арганізацыям для вядзення сельскай гаспадаркі, у тым ліку сялянскай (фермерскай), а таксама для вядзення дапаможнай сельскай гаспадаркі (далей — кадастравая ацэнка сельскагаспадарчых зямель), і праводзіцца па ініцыятыве Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

Кадастравая ацэнка зямель праводзіцца не радзей чым праз чатыры гады.

Кадастравая ацэнка сельскагаспадарчых зямель праводзіцца не радзей чым праз дзесяць гадоў. Яе вынікі падтрымліваюцца ў актуальным стане шляхам штогадовай карэкціроўкі з улікам існуючых стану зямель і іншых умоў.

Вынікі кадастравай ацэнкі зямель зацвярджаюцца Мінскім гарадскім, гарадскім (гарады абласнога, раённага падпарадкавання), раённым выканаўчым камітэтам у адпаведнасці з яго кампетэнцыяй па адабранні і выдзяленні зямельных участкаў.

Вынікі кадастравай ацэнкі сельскагаспадарчых зямель зацвярджаюцца Дзяржаўным камітэтам па маёмасці Рэспублікі Беларусь.

Звесткі аб кадастравым кошце зямель, зямельных участкаў, атрыманым пры правядзенні кадастравай ацэнкі зямель, кадастравай ацэнкі сельскагаспадарчых зямель, вынікі якіх зацверджаны ў парадку, прадугледжаным часткамі чацвёртай і пятай гэтага артыкула, уключаюцца ў рэгістр кошту зямель, зямельных участкаў.

Правядзенне кадастравай ацэнкі зямель, кадастравай ацэнкі сельскагаспадарчых зямель і падтрыманне яе вынікаў у актуальным стане ажыццяўляюцца ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Выканаўцаў работ па правядзенні кадастравай ацэнкі зямель, кадастравай ацэнкі сельскагаспадарчых зямель і падтрыманні яе вынікаў у актуальным стане вызначае Дзяржаўны камітэт па маёмасці Рэспублікі Беларусь з ліку падпарадкаваных яму арганізацый.».

**Артыкул 2.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у двухмесячны тэрмін:

забяспечыць прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя захады па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 3.** Гэты Закон уваходзіць у сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА**
*31 снежня 2014 г., г. Мінск
№ 230-З*

■ Хочаце — верце...

# ЛЕГЕНДАРНАЯ НЕРУХОМАСЦЬ І ГОРАД ПАД ВАДОЙ

## Эксперты сусветнага рынку нерухомасці адзначылі некалькі знакавых падзей мінулага года

### Эміраты «праглынулі» Скотланд-Ярд

Інвестыцыйная група Abu Dhabi Financial Group з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў летась за 370 млн фунтаў стэрлінгаў набыла будынак Скотланд-Ярда — штаб-кватэры паліцыі Вялікага Лондана. Легендарны будынак даволіся прадаць у рамках праграмы па скарачэнні выдаткаў. Яго ўтрыманне дорага абыходзілася для бюджэту брытанскай сталіцы. Пасля рэканструкцыі штаб-кватэры тут плануецца размясціць жылыя апартаменты, аднак не выключана, што ў былым будынку паліцыі з'явяцца офісы і гатэль.

Пры гэтым галоўны офіс паліцыі пераедзе ў больш кампактны будынак Curties Green на набярэжнай Вікторыі. Архітэктарам новага офіса стала бюро AHMM, якое таксама вядомае праектам лонданскай штаб-кватэры карпарацыі Google. Праектам прадугледжана стварэнне вялікага шкляной вестыбюля з грамадскімі зонамі. На даху плануецца пабудаваць зашклёны крыты павільён з канферэнц-заламі і адкрытай тэрасай з відам на Тэмзу, які будзе падсвечваецца сінім колерам.

### Аўтаномны падводны горад коштам у 26 млрд долараў

Найстарэйшая японская будаўнічая кампанія Shimizu Corporation прапанавала сваё бачанне вырашэння праблемы дэфіцыту тэрыторый — падводны горад, разлічаны на 5 тысяч жыхароў. Канцэптуальны праект называецца «Ocean Spiral 1» і ўяўляе сабой вялізную (500 метраў у дыяметры) сферу, апушчаную пад ваду. З дном яе злучыць спіралепадобны ліфт даўжынёй 15 км пры глыбіні апускання 3–4 км. Падобная сістэма больш эфектыўная для ўзняцця грузаў з вялікай глыбіні. Вакол сферы плануецца разбіць фермы для гадоўлі рэдкіх парод рыб.

Ocean Spiral будзе выконваць галоўным чынам навуковую, а таксама прамысловую функцыі. Пад вадой размесціцца навукова-даследчы цэнтр і ўстаноўка па здабычы карысных выкапняў з марскога дна. Пры гэтым унутры сферы прадугледжана месца для ўладкавання жылля, уключаючы зоны адпачынку з дарожкамі, паркамі і рэстаранамі. Ocean Spiral задумваецца як цалкам аўтаномны комплекс: генерацыя электраэнергіі будзе адбывацца за кошт розніцы тэмператур вады на розных глыбінях, а таксама сілы марской плыні. Аўтары праекта разлічваюць рэалізаваць яго на працягу 15 гадоў з аб'ёмам неабходных інвестыцый у памеры 26 млрд долараў. Аднак Shimizu Corporation прызнаюць, што тэхналогій, неабходных для будаўніцтва падобнага праекта, у свеце пакуль не існуе. Заяўленыя аб'ёмы будаўніцтва патрабуюць вялікай колькасці кампазітных матэрыялаў, здольных вытрымаць глыбакаводны ціск.





**Сяргей КУРКАЧ**

■

Ігуменскі тракт
№ 2 (103)

# РЭЙТАН. ПЕРАЗАГРУЗКА

## Беларускія мастакі вяртаюць з небыцця патрыёта Радзімы

**Імя Тадэвуша Рэйтана, славутага шляхціца, які разам з паплечнікамі ў 1773 годзе чатыры дні зрываў «падзельны» сойм Рэчы Паспалітай, чулі многія. Але ведаюць пра яго не так шмат. Пры гэтым у суседняй Польшчы Рэйтана, што нарадзіўся на тэрыторыі сучаснай Беларусі, а не на беразе Віслы, паважаюць: называюць у яго гонар вуліцы, гатэлі і ліцэі. А што ў нас? Час ад часу пра яго пісалі нарысы, але маштабна ўвекавечваць памяць пра яго пачалі толькі некалькі гадоў таму, калі энтузіясты арганізавалі арт-суполку імя Тадэвуша Рэйтана...**



Зміцер Юркевіч і Алесь Родзін.

### «ТАДЭВУШ НА 500 ПРАЦЭНТАЎ БЕЛАРУС»

Са Зміцерам Юркевічам і Алесем Родзіным, мастакамі, заснавальнікамі арт-суполкі, я сустракаюся ў галерэі «Лабірынт», што ў Нацыянальнай бібліятэцы, напярэдадні вернісажу выставы «Тадэвуш RE: TURN», прысвечанай 275-й гадавіне з дня нараджэння Тадэвуша Рэйтана. Экспазіцыя амаль зманціраваная, застаецца размясціць толькі некалькі работ, і Юркевіч, які прычоскай вельмі нагадвае беларускага шляхцюка, разам з Родзіным апантана расказваюць пра асобу Рэйтана і шляхі, якія прывялі іх да ўшанавання выбітнай асобы.

Як аказалася, усё пачалося два гады таму, калі яны даведаліся пра тое, што спрадвечная сядзіба Рэйтанаў у Грушаўцы, што на Ляхавіччыне, выстаўлена на продаж.

— Мы насамрэч гэтаму здзівіліся. Бо сядзібу зараз можа набыць любы ахвотны і пасля зрабіць там казіно ці гасцініцу. Але гэтага дапусціць нельга. Трэба талакой, дзяржавай аднавіць сядзібу, стварыць мемарыяльны музей, які ў будучыні можа стаць буйным культурным цэнтрам, — разважае Зміцер Юркевіч. — Вось мы і распачалі працу. Падсумавалі ўсё здзейсненае нашымі папярэднікамі для вяртання



Беларусі імя Рэйтана. Адзначылі, што зроблена было нямала, аднак гэта ўсё роўна кропля ў моры. Сістэмнасці не было. І гэта праца не аказвала значнага ўздзеяння. Тады мы і вырашылі стварыць арт-суполку. Спадар Алесь распачаў свой графічны шэраг «Род Рэйтанаў. Асобы. Падзеі», а я кінуўся ў бібліятэкі, беларускія і польскія архівы. Сойм з удзелам Рэйтана апісаны добра, а вось пра яго жыццё да і пасля гэтай знакавай падзеі фактычна нічога невядома. У выніку даследаванняў мы на два гады адсунулі дату нараджэння Рэйтана (з 1742 на 1740), пра што даведаліся з захаваных лістоў бацькі Тадэвуша. Вядзём перапіску з дзяржаўнымі ўстановамі, ладзім у Грушаўцы суботнікі і фестывалі. Даводзім усім, што ён наш, а не немец ці паляк, як пра яго паходжанне пісалі раней. Тадэвуш Рэйтан на 500 працэнтаў беларус! І быў беларусам у пятым пакаленні. Яго продкі служылі Вялікаму Княству Літоўскаму і абаранялі яго з самага пачатку XVII стагоддзя.

> **Адам МАЛЬДЗІС, прафесар, гісторык, пісьменнік:**
> ***— На маю думку, арт-суполка імя Тадэвуша Рэйтана, якая зрабіла вельмі шмат для ўшанавання патрыёта, павінна стварыць фонд і выкупіць у дзяржавы маёнтак у Грушаўцы. Ініцыятыва для таго, каб узяць яе ў надзейныя рукі, ужо саспела. І на гэта я вельмі разлічваю.***

### КАРЦІНА, ЯКУЮ МНОГІЯ НЕ ПРЫМАЛІ

Менавіта гэтая энергічнасць, нават ваяўнічасць да ворагаў Бацькаўшчыны дазволіла вядомаму мастаку Яну Матэйку стварыць карціну «Рэйтан» — самую вядомую і, на думку Алеся Родзіна, моцную выяву нашага героя. Тады на сойме Тадэвуш не пагадзіўся з планам падзелу Рэчы Паспалітай. У сваёй прамове Самуэль Корсак, член Найвышэйшай Літоўскай Рады, удзельнік паўстання Тадэвуша Касцюшкі, выкрыў паслоў-здраднікаў. Тыя паспяшаліся пакінуць залу, але Рэйтан упаў крыжам перад выхадам і закрычаў: «Забіце мяне, затапчыце, але не забівайце Бацькаўшчыны!» Вось і парадокс: карціну, на якой ідэалізуецца асоба Тадэвуша Рэйтана, не прынялі многія палякі. Нават спрабавалі сарваць яе выставу ў Парыжы, але не атрымалася. Калі судзіць па залатым медалі, які атрымала карціна, французы яе ацанілі.

— Матэйка не проста стварыў твор, прысвечаны Рэйтану. Ён сабраў на гэтай карціне ўсіх здраднікаў Рэчы Паспалітай канца XVIII ст. — распавядае Зміцер Юркевіч. — І найперш абураліся нашчадкі гэтых ворагаў. Мяркую, як гэты мастак, выхадзец з сялянскай сям'і, чэх па паходжанні, раптам адчуў сябе палякам і пачаў маляваць сцэны гісторыі? Але ён не спалохаўся, а наадварот пачаў кляйміць гэтых арыстакратаў.

На жаль, арыгінала гэтай карціны на выставе няма. Ён знаходзіцца ў Варшаве ў Каралеўскім замку. Затое ёсць выдатныя прыклады літаратуры пра Рэйтана з прыватных калекцый, фондаў бібліятэкі, творы мастакоў Рыгора Сітніцы, Міколы Купавы, Рыгора Батальёнка, Яўгена Шунейкі, Пятра і Алены Шарыпаў, рэпрадукцыі малюнкаў Францішка Смуглевіча... Але ўсё ж асноўную частку экспазіцыі займае графічны шэраг (амаль 60 прац) Алеся Родзіна. Сам аўтар удакладняе, што цыкл мае асветніцкі характар. На кожнай карціне адлюстравана пэўная падзея з жыцця Рэйтана, яго сям'і, аб чым напісана ў тэкставым суправаджэнні да твора. Але графічны цыкл Родзіна пакуль не завершаны. На думку сяброў арт-суполкі, у біяграфіі Рэйтана яшчэ хапае пытанняў, адказы на якія таксама трэба будзе адлюстраваць на палатне.



Партрэт Тадэвуша Рэйтана, выкананы польскім мастаком Уладыславам Барвіцкім.

Сёння, напрыклад, ніхто з упэўненасцю не скажа, дзе ён пахаваны, як скончылася жыццё Тадэвуша. На думку Змітра Юркевіча, ён мог стаць ахвярай помсты ворагаў. Бясследна знік іх сямейных архіў. Аднак ужо з'явіліся сцежкі, па якіх можна дабрацца нават да сярэбранага кубка — адзінага артэфакта, які захаваўся пасля Тадэвуша Рэйтана. І калі ўлічваць той велізарны аб'ём працы, што за кароткі час выканаў дуэт мастакоў, здаецца, што і гэта ім па плячы.

**Тарас ШЧЫРЫ.**



Асноўную частку экспазіцыі займае графічны шэраг Алеся Родзіна.

Фота Надзеі БУЖАН.

# МЛЫН ВА УКОЛЬСКУ

Край, дзе я жыву
Сумесны праект газеты «Звязда» і РГА «Белая Русь»



Млын ва Укольску. Зіма, 1954 год.

**Яшчэ ў 1970-я гады ўкольскі млын Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці служыў спраўна, малоў збожжа і калгасу, і калгаснікам. А ў 1960-я, памятаю, кожную восень пад'язджалі сюды з накаwольных вёсак вазы з паўнюткімі мяхамі. Толькі колы рыпелі пры пад'ёме на ўзгорках. У чэргах стаялі людзі з вазамі па двое сутак, тут жа і начавалі, прыходзілася. Нідзе ж паблізу і не малолі, аж з Шаркаўшчынскага раёна сюды прыязджалі. Гэты вадзяны млын быў вядомы ўсім.**

Тут і грубы памол рабілі, і панцак, і мяккую муку вышэйшага гатунку — пытляваную...

Млын быў пабудаваны яшчэ пры цары Мікалаі II, у 1911 годзе, непадалёку ад вёскі Укольск. Пра гэта расказаў Маслоўскі Іосіф Іосіфавіч, сын млынара: «Заснаваў млын мой прадзед Тамаш. Яго справу прадоўжыў дзед Пётр, а затым два ягоныя сыны — такса Пётр (мой дзядзька) і Юзаф, мой бацька (1911 г. н.). Зроблена ўсё было сваімі рукамі, сваімі сіламі. Пабудавана было на доўгія гады. Амаль стагоддзе прастаяў млын...».

Маслоўскія-малодшыя сцвярджаюць, што пабудаваць млын спачатку хацелі ў іншым месцы: у вёсцы, якраз насупраць дома каваля (дарэчы, каваль гэты — стрыечны брат млынара).

Унізе, ля рэчкі, і да гэтай пары ляжаць камяні. І па́лі пазаганяныя стаялі... З вялікімі намаганнямі ўсё рыхтавалася, але будоўлю прыйшлося адкласці. Трэба было шукаць іншае месца, дзе плынь была больш хуткая і глыбіня большая.

Кажуць, што на пабудову гэтага млына пайшло шмат золата ў манетах; што пабудавалі млын на азяраўскай зямлі, і за гэта трэба было сплачваць... І бацька каваля, Ігнат Тамашавіч, таксама прымаў удзел у будаўніцтве.

Гаспадарамі млына амаль усе гады (з 1910-х па 1980-я) былі спачатку бацька — Пётр Тамашавіч, а затым сын — Іосіф Пятровіч Маслоўскія. (Толькі ў ваенны час тут знаходзіліся іншыя людзі: нехта Таранцаў (прыезджы), а затым Талстоў Іван з Укольска, працаваў тут 4 гады. А калі Талстоў выехаў у Латвію, тады ўжо Юзаф Маслоўскі да апошніх дзён быў тут «на службе».)

З успамінаў Станіславы Маслоўскай (Далецкай), 1930 г.н., якая выйшла замуж за млынара ў 1958 годзе: «Каля хаты цякла рака, Усвіца, аж з Казненскага возера яна выцякала. У рацэ «заставы» (плаціны) былі зроблены, ваду затрымлівалі, назапашвалі. З дарогі ішоў спуск уніз, і там стаяў млын. Высокі падмурак, прасторная будыніна з каменю, нахіл з дошак (па ім мяшкі наверх бэлькай круцілі, ланцугом падымалі). А наверсе стаялі жорны, дзе малолі два вялікія каменныя кругі. Кругі былі пакладзены адзін на адзін. Ніжні быў нерухомы, а другі круціўся. І з-пад гэтага каменнага круга сыпалася мука ў падстаўленыя мяхі. Мяхі адцягвалі, муку адкопвалі, падстаўлялі новыя мяхі... А пад нізам, пад будынінай вялізнай гэтай, вада бурліла. Там вал дубовы быў, кола магутнае, дубовае круцілася, і шумела-грымела вада... Правялі электрычнасць на млын у 1970 годзе, але ён ужо пачаў разбурацца. Кола стала непрыдатным. Вада размыла сцены. А потым і плаціна рухнула».

Баба Стася ў свой час паспела распавесці: «Млын не працаваў ужо. Аднойчы (гэта здарылася ў 1984 годзе) як «жухнула» ўсё ўніз, у ваду, у вір: і сцены, і шыфер... А потым і мост абваліўся аднойчы...».

За ўсім догляд быў патрэбны, а гаспадар к таму часу ўжо памёр (летам 1980 года). Занядужаў чалавек. Праца была цяжкая, пыльная. Памёр млынар — завяршыў сваю працу і млын...

А якая прыгожая сядзіба там была! Уявіце сабе: палявая дарога, якая падымаецца, а справа — вялізная гара. Крыху далей — дуб і побач крыж каталіцкі... А млына нідзе і не відаць?! Але вось рэзкі паварот направа. Каляіны вядуць уніз... Дык вось ён, млын — злева! А справа, крышачку вышэй, «прыпынілася» вялікая, дыхтоўная хата млынара.

Высачэзная, абрывістая гара ля самай хаты заўсёды служыла надзейнай заслонай ад паўночных вятроў. А пад вокнамі хаты, з поўдня, улетку цвілі высокія, прыгожыя «кітайскія ружы». Далей, унізе за хатай, — яблыневы сад, пчаліныя вуллі. Быццам у які аазіс трапляеш!..

Налева ўнізе — брод цераз раку, дно якой усыпана каменьчыкамі. Вось якраз пад імі малы сын млынара спрытна лавіў уюноў (відэльцам!). А стоячы на мосце праз плаціну і добрай рыбы можна было навудзіць. «Заходзілі» сюды шчупакі, язі, ліні, нават яльцы.

А колькі вандроўнікаў у гэтых мясцінах пабывала — ніхто не лічыў! Хто толькі сюды не прыязджаў, не прыходзіў! Мясцовыя вадзілі сюды і вазілі гасцей з Латвіі, з Польшчы. Пабывалі тут і сталічныя жыхары з Мінска, з Рыгі. Мясціна гэтая дужа вабіла, як магнітам прыцягвала. Краявіды цудоўныя! Яны і натхнілі вядомага мастака Браслаўшчыны — Тэафана Баркоўскага — на напісанне карціны «Млын ва Укольску» (існуюць нават два варыянты яе). Калісьці мастак яшчэ са сваімі бацькамі наведваў гэтыя прыгожыя мясціны, а потым сам Тэафан падарожнічаў на веласіпедзе, сам здымаў і маляваў. Здымаў у 1974 годзе, калі млынар яшчэ жыў і працаваў, і пазней, калі млын ужо прыйшоў у заняпад. Некалькі разоў прыязджаў сюды мастак у 1990-я і рабіў замалёўкі...

А што сёння? Цяпер гэты аб'ект страчаны назаўсёды, а на яго месцы сучасная сядзіба «новага беларуса» з нашай сталіцы... Сумна, што ніхто з мінакоў цяпер сюды не загляне, не палюбуецца хараством прыроды, не адпачне душой...

**Ірына ЕРМАКОВІЧ.**

# МОСТ ГУСТАВА ЭЙФЕЛЯ

## У канцы XIX стагоддзя ён быў пабудаваны ў Баранавічах па праекце славутага француза. І гэтаму ёсць пацвярджэнне

**Адным з найвялікшых геніяў інжынернай думкі на мяжы XIX—XX стагоддзяў быў француз Густаў Эйфель. Ва ўсім свеце ён шырока вядомы сваімі дзіўнымі праектамі з металічных канструкцый. Асабліва папулярныя яго вежа ў Парыжы, жалезны каркас статуі Свабоды ў Нью-Ёрку, віядук дэ Гарабі ў Францыі... Але асаблівай любоўю і асноўным напрамкам работы Эйфеля былі масты. Яго нестандартныя рашэнні карысталіся неверагодным поспехам.**

Дарэчы, на тэрыторыі Расійскай імперыі работы Густава Эйфеля былі запатрабаванымі не менш, чым у іншых краінах. Напрыклад, ён удзельнічаў у конкурсе на будаўніцтва Троіцкага моста ў Пецярбургу, часта выконваў заказы імперскіх чыгунак.

Сёння на тэрыторыі былога Савецкага Саюза захаваліся толькі два будынкі, да канструкцыі якіх прыклаў руку Эйфель. Гэта разводны мост у Ліепаі (былая Лібаве, Расійская імперыя) у Латвіі і мост ва Унгенах у Малдавіі. Унгенская пераправа пабудавана ў 1877 годзе, перад руска-турэцкай вайной — гэта значыць за 12 гадоў да ўзвядзення вежы ў Парыжы.



Фота пачатку XX стагоддзя. Падпаленая пільня на фоне разбуранага моста Эйфеля.

Але ж гэта далёка не поўны спіс інжынерных збудаванняў на тэрыторыі былой імперыі, створаных па праектах Густава Эйфеля. І таму ёсць пацвярджэнне.

У канцы XIX стагоддзя ў невялікім мястэчку Баранавічы размясцілася чыгуначная брыгада, для патрэб якой быў выкуплены вялікі ўчастак зямлі. На ім пабудавалі спецыяльны палігон для навучання салдат чыгуначнай справе. Палігон уяўляў сабой вузкакалейнае кольца працягласцю каля 7 кіламетраў. У цэнтры кольца размясціліся казармы для пражывання трох чыгуначных батальёнаў. У будаўніцтва гэтага палігона была ўкладзена каласальная па тых часах сума — больш за 300 тысяч царскіх рублёў! Салдаты батальёнаў вучыліся пракладваць чыгуначныя шляхі, вялі зямельныя работы для падрыхтоўкі пад кладку рэек, узводзілі масты.

Для вучэбных мэт на палігоне было адведзена спецыяльнае месца, дзе салдаты вучыліся ўзводзіць часовыя масты і пераправы. Размяшчаліся яны над ярам. Улетку яр выкарыстоўвалі яшчэ для стрэльбаў, калі батальёны чыгуначнай брыгады выступалі ў летні лагер. На палігоне было некалькі мастоў, але толькі некаторыя з іх трапілі ў кадр. Адным з іх быў разборны мост Эйфеля.

Першы вопыт выкарыстання моста Эйфеля вайскоўцы чыгуначнага батальёна атрымалі пры будаўніцтве чыгункі ў Кранштацкай крэпасці ў 1891 годзе, дзе была праведзена серыя доследаў па збіранні і разбіранні моста. А вось першае прымяненне на практыцы адбылося ў 1893 годзе, пры будаўніцтве Арана-Аліцкай веткі чыгункі Санкт-Пецярбург — Варшава.

Ваенным чыгуначнікам удалося тады на практыцы апрабаваць тэхналогію для паскоранага аднаўлення мастоў разборнай канструкцыі Эйфеля. Калі ўкладачная каманда дайшла да ракі Мерачанка, верхняя канструкцыя моста, заказаная кіраўнікамі Арана-Аліцкай чыгункі, яшчэ не была гатова. Узнікла пагроза поўнага прыпынення работ на няпэўны час. Выхад з гэтага становішча знайшлі дзякуючы ваенным чыгуначнікам — па камандзе начальніка Баранавіцкай чыгуначнай брыгады з палігона было дастаўлена верхняе збудаванне разборнага моста Эйфеля, якое выкарыстоўвалася ў вучэбных мэтах. Вось так ваенныя набылі досвед устаноўкі разборнага моста ў рэальных умовах.

Пасля пачатку Першай сусветнай вайны мост, як і ўся маёмасць брыгады, заставаўся на сваім месцы. Салдаты чыгуначных батальёнаў былі адпраўлены на фронт, а ў казармах і адміністрацыйных будынках размясцілася Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Вайна ўнесла свае карэктывы, і ў верасні 1915 года, у выніку спешнага адыходу Расійскай імператарскай арміі і перанясення Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёў, палігон чыгуначнай брыгады быў моцна разбураны. Частку абсталявання вывезлі, астатняе знішчылі. Сярод знішчаных збудаванняў



Густаў Эйфель.

аказаўся і разборны мост Эйфеля.

На адным з фотаздымкаў разбурэнняў, зробленым немцамі, на фоне падарванай пільні відаць і зруйнаваны мост Эйфеля. На жаль, далейшы лёс гэтага моста невядомы. Пасля Першай сусветнай вайны згадкі пра яго не сустракаліся, магчыма, ён быў разабраны немцамі і выкарыстаны для патрэб нямецкай арміі.

Сёння на месцы яра, дзе знаходзіліся масты, размясціўся стадыён Баранавіцкага дзяржаўнага універсітэта. У народзе гэта месца называюць «конскія горы» — карані назвы ідуць ад больш позняга перыяду гісторыі горада Баранавічы. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя.




Паштоўка пачатку XX стагоддзя з выявай ваенных чыгуначнага батальёна. Злева — мост Эйфеля.

**Рамуальд ЖАБІК.**
**Фотаздымкі, планы і паштоўкі з асабістага архіва аўтара**
*г. Баранавічы*

■ Традыцыі і сучаснасць

## «...І КУДЫ ШТО ПАДЗЕЛАСЯ?»

Адказ на гэтае пытанне прапанаваў знайсці фольк-тэатр «Госьціца». У святочны вечар 19 снежня ён запрасіў на вечарыну-сустрэчу. Найперш тых, хто любіць беларускі фальклор. А любіць яго ёсць за што: дажыў, дайшоў і захаваў для нас нейкі зварот з мінулых стагоддзяў, распавядае пра тое, як было ў нас, што было, пра што і чаму; пра людзей; пра тое, як жылі і якія былі паміж імі адносіны, што лічылася добрым ці дрэнным. Энергію, эмоцыю, уласцівыя цэламу народу ўтрымлівае. І цяпер.

Народ, між іншым, гэта адчувае. Нездарма ж у нас так шмат фальклорных гуртоў, прычым частка з іх ахвотна працуе для моладзі і з моладдзю — значыць, ёсць інтарэс, ёсць запатрабаванасць. І ёсць нават жаданне рабіць фальклор модным, «трэндавым» кірункам на айчыннай сцэне (чаму спрыяюць тыя ж фольк-фестывалі). Ёсць імкненне яго развіваць, інтэрпрэтаваць, ствараць на яго глебе нешта сваё, новае, мастацкае. Фольк-тэатр "Госьціца" — менавіта такі. Ён з традыцыяй, з фальклорам. Але пры гэтым — наватарскі. Напэўна, гэта так прыцягвала ў яго шэрагі маладых і таленавітых (шмат хто з былых удзельнікаў сёння плённа працуе ў тэатры і на эстраднай глебе). А магчыма, і тое, што кіраўнік Ларыса Сімаковіч скіравана на эксперымент, прапануе задачы, цікавыя для вырашэння: тут вам не проста аўтэнтычная песня, тут важная і акцёрская праца, і танец. І асаблівы светапогляд, і філасофія. Гэта глыбока.

Можа, таму былыя з «Госьціцы» — усё адно свае. Таму падчас прэзентацыі імкнуліся звярнуць увагу на тых, хто прайшоў праз «Госьціцу» ў розныя часы (нават асобны буклет з выявамі удзельнікаў ёсць). І іх запрасілі на канцэрт-сустрэчу ў канцэртную залу «Мінск» — слухаць, успамінаць, спяваць разам. Таму што ў другім альбоме фольк-тэатра сабраны песні розных гадоў (запісы з 1986-га па 2005-ы). Нездарма ж гэты дыск атрымаў такую красамоўную назву «...І куды што падзелася?» Не падзелася: на гэтай вечарыне з тэатралізаванай дзеяй цэлых спеўных 5 прэм'ер — ад Ларысы Сімаковіч і Аляксандры Грахоўскай. Насамрэч у гэтым кантэксце важна тое, што сама «Госьціца» нікуды не падзелася — ёсць, мае энергію рабіць справу, ствараць і збіраць вакол сябе аднадумцаў і тых, хто хоча зразумець, у чым асаблівасць беларускага светапогляду і чым яго можа ўзбагаціць сучаснасць.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

# КАЛЯДНЫЯ ПЕРНІКІ

**Пастунова мінае час калядна-навагодніх свят, вось ужо і стары Новы год прайшоў. Апошні кулінарны сімвал гэтай пары, пра які хочацца расказаць, — гэта калядныя пернікі.**

Зразумела, пернікі ў нас выпякалі не толькі на Божае Нараджэнне (у цені якога хаваўся і такі малазначны некалі прысвятак як Новы год). Напрыклад, рабілі вялікія пернікі ў форме сэрца, упрыгожаныя цукровымі ўзорамі, якімі на Віленшчыне ды Гарадзеншчыне сустракалі дзень святога Казіміра. Або традыцыйныя пернікі з Міра, у форме цацачных салдацікаў, палітыя цукрам, — гэтыя ўжо не да нейкага канкрэтнага свята рабіліся, але да кожнай урачыстай або жалобнай нагоды: на вяселлі, хрэсьбіны, памінкі, провады. Або дзецям давалі ў падарунак за добрыя паводзіны. Або ад хлопцаў дзяўчатам дарыліся на вячоркі-попрадкі — у тыя часы, калі такія рэчы былі яшчэ рэдкімі і цаніліся.

Традыцыя пячы пернікі на Каляды параўнальна новая, запазычаная. Яна нарадзілася ў Германіі прыкладна ў XV стагоддзі і паступова прывандравала да нас. Да вялікіх паноў, можа, ужо ў XVIII стагоддзі. А да люду паспалітага — не раней за XIX стагоддзе. Зрэшты, як сказаць «новая», калі за апошнія гадоў 75, за эпоху сацыяльных эксперыментаў, паспелі ўжо пра яе і забыцца? Як тады назваць тых, хто такую традыцыю спрабуе вярнуць? Наватарамі або рэтраградамі? Не магу вырашыць сам, хай кожны ацэніць гэта па-свойму.

Вось як прыгадвае свае дзіцячыя ўражанні гомельскі пробашч айцец Славамір Ляскоўскі, у сям'і якога традыцыя была непарыўнай: «За некалькі тыдняў мама гатавала цеста для калядных пернікаў. Таму што яны павінны доўга ляжаць, каб стаць смачнымі. Гэта самы галоўны тыповы для каталіцкай пачастунак на Каляды». У нейкім сэнсе калядныя пернікі адыгрывалі тую самую сімвалічную функцыю, што і сліжыкі або ламанцы, — выступаючы больш прыгожымі і смачнымі заменнікамі куцці або аплаткаў для прычасця.

Гродзенская галерэя рамёстваў "Ткалля" да традыцыі рабіць пернікі падышла вельмі крэатыўна і стварыла (ці, магчыма, аднавіла) старадаўні народны вобраз каляднай Казы ды прыстасавала яго да адмысловай разной дошкі для пернікаў. Так вось сустрэліся на пернікавай дошцы паганскія Каляды і хрысціянскае Божае Нараджэнне.

А тут яшчэ адна добрая нагода надарылася: у гарадзенскай антыкварні «Жывы Час», незадоўга да Калядаў і Новага года, адбылася вечарына «Смакі старой Гародні», арганізаваная краязнаўцамі і гісторыкамі, што вывучаюць напаўзабытыя традыцыі горада над Нёманам. Кожны прысутны мог пакаштаваць некалькі адноўленых даўніх гарадзенскіх страў: сырнік, селядзец у віннім соусе і македонскую бузу, папулярную ў міжваеннай Гародні гадоў гэтак 80 таму. Вядома, частавалі на той вечарыне і пернікамі, пячатнымі з драўляных дошак галерэі «Ткалля». На перніках адбівалі не толькі сімвалічную калядную Казу, але і выяву геральдычнага патрона Гародні — святога Губерта з яго аленем. Вось і мяркуйце самі, што гэта: спроба аднаўлення старой традыцыі або пачатак новай? Мне, хоць і кансерватару, больш прыемна думаць, што другое.




У якасці ілюстрацыі, і ў тым ліку дзеля рэцэпта, дазвольце падзяліцца выявай прыгожых паштовак, створаных у «Ткаллі». А наступным разам раскажу пра іншую гродзенскую страву (з той самай вечарыны), за якой стаіць не абы-якая гісторыя, датычная адразу некалькіх краін.

### ГАРАДЗЕНСКІ ПЕРНІК

*(рэцэпт галерэі «Ткалля»)*

**Складнікі:** *600 г мукі, 2 яйкі, 40 г масла, 200 г цукру, 250 г мёду, 0,5 ч. лыжкі соды, 1—2 ч. лыжкі сумесі прыпраў (гвоздзіка, цынамон, аніс).*

**Спосаб прыгатавання:** Мёд разагрэць, дадаць прыправы. Астудзіць. Асобна расцерці яйкі з цукрам і маслам. Дабавіць муку, соду, мёд. Перамяшаць. Раскачаць цеста пластом таўшчынёй 0,5—0,7 см. Пакласці на пернікавую дошку і адбіць малюнак. Пернік выпякаць 20—25 хвілін пры тэмпературы 150 градусаў.

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТМАШ»

| Номер лота | Наименование имущества | Год выпуска | Инв. № | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | Токарно-винторезный станок 16К20 | 1983 | 1028 | 23 750 000 | 2 375 000 |
| **Лот № 2** | Универсальный вертикально-сверлильный станок 2Н135 | 1983 | 1031 | 14 448 000 | 1 444 800 |
| **Лот № 3** | Токарно-винторезный станок 16К20 | 1983 | 1034 | 23 750 000 | 2 375 000 |
| **Лот № 4** | Токарно-винторезный станок 16К20 | 1983 | 1045 | 23 750 000 | 2 375 000 |
| **Лот № 5** | Токарно-винторезный станок 16К20ПФ | 1983 | 1046 | 29 176 000 | 2 917 600 |
| **Лот № 6** | Токарно-винторезный станок 16К20ПФ | 1983 | 1047 | 29 176 000 | 2 917 600 |
| **Лот № 7** | Горизонтально-фрезерный станок 6р82 | 1983 | 1070 | 41 941 000 | 4 194 100 |
| **Лот № 8** | Вертикально-сверлильный станок 2Н-125 | 1984 | 1090 | 15 878 000 | 1 587 800 |
| **Лот № 9** | Пресс-ножницы комбинированные НВ-522 | 1985 | 1142 | 22 145 000 | 2 214 500 |
| **Лот № 10** | Универсальный вертикально-сверлильный станок 2Н135 | 1986 | 1183 | 14 448 000 | 1 444 800 |
| **Лот № 11** | Гидравлический одностоечный пресс П6126А | 1986 | 1184 | 25 985 000 | 2 598 500 |
| **Лот № 12** | Машина листогибочная с поворотной балкой | 1986 | 1215 | 82 621 000 | 8 262 100 |
| **Лот № 13** | Долбежный станок 7403 | 1986 | 1247 | 23 706 000 | 2 370 600 |
| **Лот № 14** | Станок специальный консольно-фрезерный ВМ127 | 1989 | 1319 | 63 333 000 | 6 333 300 |
| **Лот № 15** | Универсальный фрезерный станок М676 | 1997 | 1509 | 12 074 000 | 1 207 400 |
| **Лот № 16** | Станок поперечно-строгальный М7307 | 1998 | 1635 | 14 052 000 | 1 405 200 |
| **Лот № 17** | Пресс П6324 | 1979 | 132016 | 11 875 000 | 1 187 500 |
| **Лот № 18** | Станок координатно-расточной 2А450 | 1974 | 408 | 36 757 000 | 3 675 700 |
| **Лот № 19** | Станок токарный 1М63 | 1976 | 616 | 43 155 000 | 4 315 500 |
| **Лот № 20** | Станок универсальный гравировальный 6Л463 | 1976 | 633 | 4 858 000 | 485 800 |
| **Лот № 21** | Станок настольно-сверлильный 2М112 | 1977 | 655 | 4 172 000 | 417 200 |
| **Лот № 22** | Поперечно-строгальный станок 7Е35 | 1978 | 765 | 11 325 000 | 1 132 500 |
| **Лот № 23** | Станок настольно-сверлильный 2М112 | 1978 | 808 | 4 172 000 | 417 200 |
| **Лот № 24** | Токарно-винторезный станок 16К20 | 1978 | 810 | 23 750 000 | 2 375 000 |
| **Лот № 25** | Зуборезный станок 53А30 | 1982 | 984 | 16 830 000 | 1 683 000 |

| | |
|---|---|
| **Местонахождение объекта** | г. Минск, ул. Брестская, д. 34 |
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Продавец (Балансодержатель)** | ОАО «Брестмаш» |
| **Организатор торгов** | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 5-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369 УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 25 февраля 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, 4-222 Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

**Для участия в аукционе необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».

2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

* Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20% от продажной цены объекта, стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов Поверенному.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресам: г. Минск, ул. Чапаева, 4, каб. 222; г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**

**<u>Последний день приема заявлений</u> – 24 февраля 2015 г. до 17.00.**
**<u>Контактные тел.</u>: 8 029 626 72 52; 8 0162 23 92 59.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **ЛОТ № 1. Трактор Беларус 82.1, рег. знак БЯ 6667, 2004 г.в., начальная стоимость лота 77 605 000 белорусских рублей** |
| **Собственник (владелец) имущества** | Открытое Акционерное Общество «Лепель-лён» |
| **Местонахождение имущества** | Витебская области, Лепельский район, Лепельский с/с, пос. Белоозерный. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ОАО «Лепель-лён» Сможевский Владимир Аркадьевич, тел.: 8 (02132) 4-78-25, (8 02132) 4-16-02 |
| **Наличие обременений** | Не имеется |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 316, 05 февраля 2015 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, 210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 316. Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 60 02 63. Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 10.00 05 февраля 2015 года.<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

### СПРАВАЗДАЧА
**Міжнароднага дабрачыннага фонду «Праект дапамогі дзецям Чарнобыля» аб скарыстанні сваёй маёмасці за 2014 год**

1. Колькасць заснавальнікаў Фонду — 8.

2. Набытая маёмасць — 2 будынкі (2 дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, перададзеныя на бязвыплатнай аснове).

3. Грашовыя сродкі, паступіўшыя ад заснавальніка ў якасці замежнай дабрачыннай дапамогі, — 266 890 еўра.

4. Грашовыя сродкі ад грамадзян Рэспублікі Беларусь не паступалі.

5. Агульная сума расходаў, панесеных Фондам на дасягненне грамадска карысных мэтаў, адпавядаючых статусу, — 3 677 555 710 беларускіх рублёў.

6. Прадпрымальніцкая дзейнасць Фондам не вялася.

УНП 805001004

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 20.02.2015 г. в 15.00**
**по адресу: 220030, г. Минск, ул. Кирова, 18, 3-й этаж, пом. 99**
**(конференц-зал «Талер»).**
**Организатором аукциона является республиканское унитарное предприятие**

# «Президент-Отель»,

**находящееся по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 18.**

<u>На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:</u>

1. Помещение № 19 площадью 20,7 кв.м на первом подвальном этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 527 850 рублей; размер задатка – 52 750; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 20.01.2015 по 19.02.2015 с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00, по адресу: г. Минск, ул. Кирова 18, к. 602. Документы, поданные после 16.00 19.02.2015, не рассматриваются.**

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

<u>Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:</u>

*- перечисляет задаток на р/с № 3012000011054 в ОАО «АСБ «Беларусбанк», код банка – 795, УНП 192287408, ОКПО 381798305000, государственное предприятие «Президент-Отель»;*

*- подает заявление на участие в аукционе;*

*- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;*

*- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.*

<u>Помимо указанных документов:</u>

***- физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и(или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 10 000 000 рублей.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефоны для справок: (8-017) 229-70-39, (8-029) 117-56-22.**

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**

- ✓ Оценка оборудования и транспортных средств
- ✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ✓ Независимая строительная экспертиза

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Гомельский жировой комбинат», 8(0232)36 07 04

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | - изолированное помещение (квартира № 22) с инв. № 350/D-270744 площадью 67,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 87-22, по начальной цене – 746 000 000 рублей без НДС; - набор кухонного гарнитура «Европа», по начальной цене – 54 045 600 белорусских рублей с НДС; - стенка корпусная, по начальной цене – 28 232 400 белорусских рублей с НДС; - шкаф-купе, по начальной цене – 14 840 400 рублей с НДС; - комплект штор для спальни 2,2x2,4, по начальной цене – 404 400 рублей с НДС; - комплект штор для зала № 1 5,0x2,4, по начальной цене – 919 200 рублей с НДС; - шкаф Клевер П 30-02 (2 ед.), по начальной цене – 12 636 000 рублей с НДС; - стол туалетный ГМ 5189 Дуб белый/пат «Фальконе», по начальной цене – 15 080 400 рублей с НДС; - кровать ГМ 5181 Дуб белый/пат «Фальконе», по начальной цене - 21 118 800 рублей с НДС; - тумба ГМ 5166 Дуб белый/пат «Фальконе», по начальной цене – 34 905 600 рублей с НДС; - стол обеденный ГМ 6035 Дуб белый/пат «Фальконе», по начальной цене – 10 642 800 рублей с НДС; - шкаф для платья и белья ГМ 5154 Дуб белый/пат «Фальконе», по начальной цене – 41 998 800 рублей с НДС; - шкаф ГМ 5151 Дуб белый/пат «Фальконе», по начальной цене – 15 586 800 рублей с НДС; - кондиционер Daikin (внутренний блок FTYN35GX, наружный блок RYN35GX), по начальной цене – 6 878 400 рублей с НДС; - система видеонаблюдения, по начальной цене – 7 413 600 рублей с НДС; - охранно-пожарная сигнализация, по начальной цене – 12 176 400 рублей с НДС; - матрас 29 модерн з/л, по начальной цене – 15 927 600 рублей с НДС; - угловой диван-кровать «Фаворит», по начальной цене – 8 245 200 рублей с НДС; - банкетка ГМ 5199 Дуб белый/пат «Фальконе», по начальной цене – 4 026 000 рублей с НДС; - жалюзи горизонтальные, по начальной цене – 970 800 рублей с НДС; - зеркало ГМ 5191 Дуб, по начальной цене – 1 376 400 рублей с НДС; - ковер ESTELLE 75x160, по начальной цене – 1 072 800 рублей с НДС; - ковер «София» 1,6x2,2, по начальной цене – 3 147 600 рублей с НДС; - ковер 46700/66, по начальной цене – 1 072 800 рублей с НДС; - ковер LILIUM, по начальной цене – 3 290 400 рублей с НДС; - комплект штор для зала № 2 2,0x2,4, по начальной цене – 367 200 рублей с НДС; - комплект штор для кухни 2,0x2,46, по начальной цене – 376 800 рублей с НДС; - покрывало 2,5x2,45, по начальной цене – 764 400 рублей с НДС; - сетка москитная (2 ед.), по начальной цене – 475 200 рублей с НДС; - стекло скинали, по начальной цене – 1 084 800 рублей с НДС; - стул ГМ 3014 Дуб белый/пат «Фальконе» (6 ед.), по начальной цене – 24 235 200 рублей с НДС; - тумба 580x200x750, по начальной цене – 824 400 рублей с НДС; - тумба под умывальник Квадро Н 90-01, по начальной цене – 5 128 800 рублей с НДС; - тумба прикроватная ГМ 5182 Дуб белый/пат «Фальконе» (2 шт.), по начальной цене – 10 692 000 рублей с НДС; - фильтр для воды EXCITO, по начальной цене – 838 800 рублей с НДС; - шкаф зеркальный Клевер, по начальной цене – 6 318 000 рублей с НДС. | 1 113 114 800 | 111 311 480 |
| 2 | - капитальное строение (производственное здание цеха переработки яблок) с инв. № 320/С-28795 площадью 241,4 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Красноборежский с/с, аг. Красный берег, ул. Заводская, 4А | 198 720 000 | 19 872 000 |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 29 января 2015 г**. в рабочие дни с 9.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **30 января 2015 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2, |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в РД № 700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 Получатель платежа: Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |
| **Условия продажи** | Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. |

**Дополнительная информация по тел. (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс) и на сайте www.bti.by**

**ЗАПРАШАЕМ РАЗМЯСЦІЦЬ РЭКЛАМУ Ў ГАЗЕЦЕ «ЗВЯЗДА»**
**Тэл./факс: (8 017) 287 17 79, 292 04 52. E-mail: reklama@zviazda.by.**

■ Гарызонты

## Сяргей ЧЫЖЫК:

# «ЗАРАБІЦЬ ДОБРЫЯ ГРОШЫ Ў НАВУЦЫ МОЖНА»

**Другі беларускі касмічны апарат можа быць створаны на працягу трох гадоў пасля прыняцця адпаведнага рашэння. Пра гэта падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА паведаміў першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей ЧЫЖЫК.**



Фота БЕЛТА.

### БЕСПІЛОТНІКІ І НОВЫЯ СУПРАЦЬПУХЛІННЫЯ ПРЭПАРАТЫ

Сяргей Чыжык падкрэсліў, што Беларусь з'яўляецца касмічнай дзяржавай, паколькі мае свой спадарожнік. «...Мы кіруем ім, апрацоўваем атрыманыя звесткі, «выцягваем» усё больш дэталізаванай, спецыялізаванай інфармацыі...» Аднак, паводле яго слоў, трэба думаць на перспектыву, бо тэрмін службы першага касмічнага апарата складае 5-7 гадоў. А будаўніцтва новага спадарожніка — дарагое мерапрыемства.

У 2014 годзе ў акадэміі было адкрыта каля 10 інавацыйных вытворчасцяў. Напрыклад, створаны вытворчы ўчастак трафарэтнага друку для падрыхтоўкі і нанясення люмінафорных кампазіцый на розныя матэрыялы. Яны выкарыстоўваюцца для святлодыёднай тэхнікі. Уведзена ў строй міжнароднае прадпрыемства «ПраймСінтэз» на базе Інстытута біяарганічнай хіміі НАН і расійскай кампаніі «Фармсінтэз» з мэтай сумесных распрацовак і прасоўвання фармацэўтычнай прадукцыі на рынкі Беларусі і Расіі. Доследна-прамысловая вытворчасць біяпрэпаратаў рознага прызначэння створана Інстытутам мікрабіялогіі НАН Беларусі.

Вытворчасць замарожаных бактэрыяльных канцэнтратаў для малочнай прамысловасці адкрыта на базе Інстытута мяса-малочнай прамысловасці. З яго ўводам ужо на 60% можна забяспечыць рынак Беларусі такой прадукцыяй і сэканоміць штогод больш за $5 млн. З'явіўся рэспубліканскі навукова-медыцынскі цэнтр «Клетачныя тэхналогіі», дзе для лячэння пацыентаў выкарыстоўваюцца ствалавыя клеткі.

На 2015 год таксама запланаваны запуск каля 10 вытворчасцяў.

— Мы хочам завяршыць стварэнне цэнтра па вытворчасці шматфункцыянальных беспілотных лятальных апаратаў. У гэтым кірунку Беларусь дасягнула поспеху, сёння ў нас выпускаецца тры тыпы апаратаў, чацвёрты асвойваем — на адлегласці палётаў да 300 км, — з гонарам зазначыў Сяргей Чыжык. — Да канца года павінен быць уведзены ўчастак па выпуску гемасарбентаў — спецыялізаваных вадкасцяў для ачышчэння крыві. Будзе завершаны цэлы шэраг аб'ектаў у Цэнтральным батанічным садзе.

Акрамя таго, будзе адкрыта вытворчасць новых супрацьпухлінных і супрацьвірусных фармацэўтычных апаратаў на аснове айчынных субстанцый.

### «БЕЛБІЯГРАД» У АКАДЭМГАРАДКУ

Асобна Сяргей Чыжык спыніўся на стварэнні навукова-тэхналагічнага парка «БелБіяград», на базе якога будуць развівацца такія галіны, як біятэхналогіі, фармацэўтыка, нана- і мікрасістэмная тэхніка.

Плануецца, што «БелБіяград» запатрабуе ўкладання мінімальнай колькасці бюджэтных сродкаў. Акцэнт будзе зроблены на пошук і прыцягненне да працы інвестараў.

— Мы разлічваем атрымаць пэўныя прэферэнцыі, хацелася б, каб яны былі супастаўныя з тымі, якія створаны для Парка высокіх тэхналогій. — Хочацца адзначыць, што спецыфіка стварэння падобных тэхнапаркаў у свеце заключаецца ў тым, што першапачаткова ствараецца інфраструктура, набываецца абсталяванне, а пошукам спецыялістаў займаюцца ў апошнюю чаргу. А мы пайшлі іншым шляхам: адштурхоўваемся не ад інфраструктуры, а ад кадраў. Шмат інстытутаў НАН Беларусі сёння працуюць у напрамках, якія могуць быць карыснымі і патрэбнымі пры стварэнні тэхнапарка. Мяркуецца, што навукоўцы будуць прапаноўваць і рэалізоўваць перспектыўныя праекты.

Чакаецца, што навукова-тэхналагічны парк будзе размяшчацца ў раёне Акадэмгарадка ва Уруччы. Будынак ужо падабраны, запланавана яго рэканструкцыя.

**У Акадэміі навук працуе цэлая сістэма па падтрымцы маладых навукоўцаў, накіраваная на рэалізацыю іх навуковага і творчага патэнцыялу, а таксама матэрыяльнае стымуляванне працы.**

Па словах Сяргея Чыжыка, сітуацыя ў навуковым свеце імкліва змяняецца: «Безумоўна, трэба рэагаваць на сітуацыю вельмі аператыўна, у тым ліку ў тэхналагічных распрацоўках. Таму мы разумеем, што трох-пяцігадовае планаванне навукі — гэта занадта працяглыя перыяды: трэба быць гатовымі да змен патрэб рынку і размяшчэння на ім гульцоў».

### ДОМ НА 3D-ПРЫНТАРЫ

Адказваючы на пытанне аб перспектывах развіцця і прымянення ў Беларусі 3D-друку, Сяргей Чыжык не выключыў магчымасці, што ўжо праз пяць гадоў у нас можна будзе будаваць дамы з дапамогай 3D-прынтараў.

— Уявіце сабе: прывозяць на ўчастак 3D-прынтар, кран-бэльку і ў адзін заход будуюць ваш катэдж. І гэта не фантастыка, а рэальнасць. Я ўжо бачу, якое прадпрыемства магло б гэтым заняцца. Галоўнае — правільна падабраць будаўнічы матэрыял. І беларускія навукоўцы ўжо абмяркоўваюць магчымасці распрацоўкі бетону, які хутка цвярдзее. Калі гэта запрацуе? Мяркую, што пяць гадоў — і будзем карыстацца. Цяпер усё хутка робіцца, — канстатаваў Сяргей Чыжык. — У Беларусі ўжо працуюць каля сотні 3D-прынтараў. Мы павінны імкнуцца, каб як мага больш прадуктаў на іх выраблялася. Прычым каб яны выраблялiся не толькі для дэманстрацыі магчымасцяў 3D-друку, што часцей за ўсё бывае, а для канкрэтнага прымянення.

3D-друк — гэта адытыўныя тэхналогіі (addition — дадаваць), стварэнне прадукту дабаўленнем частак матэрыялу. Гаворка ідзе пра эканомію матэрыялаў, мінімізацыю адходаў. Можна стварыць зусім унікальныя вырабы нават у адзін падыход, усё можна замяніць адной аперацыяй.

### ПРЫСТУПКІ ДЛЯ КАР'ЕРНАГА РОСТУ

Закранаючы тэму заробкаў навукоўцаў і прыцягнення ў навуку моладзі, першы намеснік старшыні Прэзідыума НАН падкрэсліў, што зарабіць сёння добрыя грошы ў навуцы можна. І нават у першыя гады сваіх заняткаў навуковай дзейнасцю. Але тут важна, у які калектыў ты трапіў, хто твой загадчык лабараторыі, наколькі паспяхова ён працуе, ці прыцягвае гранты. Зарабіць добрыя грошы можна толькі ў тым выпадку, калі ты атрымліваеш не толькі бюджэтнае фінансаванне, але таксама маеш дагаворы з галінамі і, магчыма, міжнародныя кантракты. Але, на жаль, нельга сказаць, што колькасць такіх паспяховых лабараторый блізкая да 100%, хутчэй з усё, гэта 30% лабараторый.

Сяргей Чыжык адзначыў, што ў Акадэміі навук працуе цэлая сістэма па падтрымцы маладых навукоўцаў, накіраваная на рэалізацыю іх навуковага і творчага патэнцыялу, а таксама матэрыяльнае стымуляванне працы. Штогод праводзяцца конкурсы па выдзяленні грантаў аспірантам і суіскальнікам для выканання іх дысертацыйных работ, конкурсы на лепшую першую навуковую працу, конкурсы навуковых праектаў маладых навукоўцаў на атрыманне грантаў Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў. Штогод разглядаюцца прэтэндэнты на прэзідэнцкую стыпендыю, і кожны год 40-50 чалавек з акадэміі трапляе ў гэты спіс.

— У навуцы важныя стымулы. Мы не павінны маладога чалавека адпраўляць на руціну, каб той нават не паспеў убачыць прыгажосць навукі і яе прастор — ён павінен працаваць на пярэднім краі навукі разам з добрым кіраўніком. Маладыя вучоны павінен бачыць кар'ерны рост, таму што ў навуцы, як ні ў адной іншай галіне, бачныя гэтыя прыступкі, — растлумачыў Сяргей Чыжык. — Яны рэгламентаваны праходжаннем дысертацыйных прыступак: кандыдацкая дысертацыя, доктарская, а гэта ў сваю чаргу звязана са службовымі магчымасцямі. Плюс маладыя людзі заўсёды звяртаюць увагу на жыллёвае пытанне. І сёння мы практычна 100% сваіх аспірантаў можам забяспечыць інтэрнатам. Акрамя таго, сёлета адбыўся грандыёзны зрух за кошт ўвядзення ў строй арэнднага жылля. Мы атрымалі комплекс «Магістр» — гэта больш за сотню кватэр, адна-, двухпакаёвых, і тыя маладыя, якія прыйшлі да нас на працу, маюць вельмі высокі шанц яго атрымаць.

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■



Фота Надзеі БУЖАН.

## УНІКАЛЬНЫ САРБЕНТ

**Вучоныя БДУ прапанавалі ўнікальную распрацоўку па ліквідацыі аварыйных разліваў нафты і нафтапрадуктаў на паверхні акваторый і сушы і ачышчэння паверхневых і сцёкавых вод ад напластаванняў нафты і нафтапрадуктаў.**

«Лігнасорб» створаны ў Навукова-даследчым інстытуце фізіка-хімічных праблем БДУ. Яго распрацоўшчыкамі сталі супрацоўнікі лабараторыі раствораў цэлюлозы і прадуктаў іх перапрацоўкі. Навукова-даследчая праца выконвалася пад кіраўніцтвам загадчыка лабараторыі, доктара хімічных навук прафесара Дзмітрыя Грыншпана.

Сарбент «Лігнасорб» выкарыстоўваецца ў выглядзе парашку з буйнатанажных адходаў гідролізнай вытворчасці. У нашай краіне сыравінай для вытворчасці «Лігнасорбу» з'яўляюцца адходы Рэчыцкага і Бабруйскага гідролізнага заводаў.

«Лігнасорб», у адрозненне ад іншых прыродных сарбентаў, не патрабуе дадатковых выдаткаў на здабычу і перавозку, не тоне разам з нафтай, а ператварае яе ў цвёрдае высокакаларыйнае паліва. Сарбент прызначаны таксама для ўтылізацыі адпрацаваных індустрыяльных і расліныых алеяў шляхам ператварэння іх у экалагічна бясшкодныя гранулы або брыкеты, якія лёгка спальваюцца ў звычайных печах для цвёрдага паліва.

Новая распрацоўка навукоўцаў БДУ прызначана для прымянення ў хімічнай і нафтавай прамысловасцях, а таксама пры аварыйных сітуацыях.

## БІЯПРЭПАРАТЫ НОВАГА ПАКАЛЕННЯ

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце распрацаваны новыя бяспечныя фармацэўтычныя субстанцыі для ветэрынарыі і на іх аснове — біяпрэпараты новага пакалення. Над іх распрацоўкай і даследаваннем працавалі навукоўцы кафедры мікрабіялогіі і лабараторыі біятэхналогіі біялагічнага факультэта БДУ.**

Гэта ўнікальныя ў сваім родзе прэпараты, паколькі дзеючымі рэчывамі з'яўляюцца «ахоўныя» бялкі (інтэрфероны) саміх жывёл, а не антыбіётыкі і хіміятэрапеўтычныя складнікі, што гарантуе абсалютную бяспеку выкарыстання новага лякарства. Дзякуючы інтэрферону клеткі становяцца неўспрымальнымі ў дачыненні да віруса.

Біяпрэпараты валодаюць высокай ступенню неспецыфічнай антывіруснай і імунастымулюючай актыўнасці. Акрамя таго, фармакалагічныя складнікі аказваюць антыстрэсавае дзеянне і станоўча ўплываюць на рэпрадуктыўныя функцыі жывёл. Створаныя субстанцыі адрозніваюцца ад раней вядомых таксама відаспецыфічнасцю. Напрыклад, лячэнне цялят ажыццяўляецца прэпаратамі, створанымі спецыяльна для буйной рагатай жывёлы, парасят — для свіней і г.д.

## ЗАЙМАЛЬНАЯ МАТЭМАТЫКА



**Нацыянальны адукацыйны партал запрашае навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі прыняць удзел у конкурсе «Займальная матэматыка».**

На форуме нацыянальнага адукацыйнага партала ў тэме «Займальная матэматыка» будуць рэгулярна з'яўляцца займальныя матэматычныя задачы. Навучэнцы могуць прапаноўваць свае варыянты рашэння, а калі на працягу 24 гадзін не будзе атрымана ніводнага правільнага адказу, то адміністратары форуму размесцяць рашэнне задачы.

Першы з удзельнікаў форуму, які рашыў правільна задачу і апублікаваў яе рашэнне на форуме, атрымае прызавыя балы. Па выніках удзелу ў конкурсе лепшыя вучні будуць узнагароджаны прызамі. Конкурс працягнецца да канца навучальнага года. Тым, хто хоча прыняць удзел у праекце, трэба адправіць на email: www.adu.by@gmail.com заяўку і ўказаць сваё прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам); клас; установу адукацыі і хатні адрас.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Прызванне

# ФОРМУЛА ПОСПЕХУ ДОКТАРА САЧАКА

**У Віцебску, непадалёк ад галоўнага корпуса медуніверсітэта, размешчаны білборд з фотапартрэтам Міхаіла Рыгоравіча Сачака — доктара медыцынскіх навук, прафесара, загадчыка кафедры шпітальнай хірургіі з курсамі ўралогіі і дзіцячай хірургіі Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, ганаровага акадэміка Беларускай акадэміі медыцынскіх навук і ганаровага грамадзяніна горада Віцебска. Летась яму прысвоена званне «Чалавек года Віцебшчыны». Між тым, урачом гэты хлопец з вёскі Варанічы, што на Гродзеншчыне, стаў амаль выпадкова.**




Старэйшая сястра, якая на той час ужо заканчвала педагагічны інстытут, прыняла рашэнне: у сям'і павінен быць доктар! Брат і яшчэ адна сястра таксама мелі вышэйшую адукацыю, хоць іх маці Антаніна Ігнатаўна была зусім непісьменная, а тата Рыгор Іванавіч наведваў школу толькі адну зіму. Міша наогул любіў лес ды марыў стаць лесатэхнікам. Але ж паслухаўся сястру і паступіў у Віцебскі медыцынскі інстытут. Працаваць пасля заканчэння паехаў у вёску Дварэц Чашніцкага раёна. А праз год Міхаілу ўжо даверылі пасаду хірурга і галоўнага ўрача Лепельскага раёна. Тут ён пачаў асвойваць складаныя аператыўныя ўмяшанні. За гады работы заваяваў велізарны аўтарытэт у мясцовых жыхароў, так што старшакласнікі нават пісалі пра яго ў сваіх сачыненнях.

Дарэчы, сённяшні намеснік галоўнага ўрача Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Аляксандр Гурэвіч, які «прыдумаў» адзіны хірургічны цэнтр — свайго роду цэх па правядзенні эндаскапічных аперацый — у адным з інтэрв'ю сказаў: «Жаданнем стаць урачом «заразіў» мяне, сам таго не падазраючы, у Лепелі, адкуль я родам, выдатны хірург і чалавек Міхаіл Рыгоравіч Сачак…»

У Лепелі нядаўні выпускнік Віцебскага медінстытута паставіў перад сабой задачу распрацаваць рэканструктыўныя аперацыі на трахеі і бронхах — у той сферы, дзе і савецкая, і сусветная хірургія мелі шмат пытанняў. Цікаўнасць і дапытлівасць дазволілі Міхаілу праз дзесяць гадоў пасля заканчэння інстытута ва ўмовах сельскага раёна падрыхтаваць і абараніць дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата медыцынскіх навук.

У пачатку 60-х Міхаіл Рыгоравіч узначаліў хірургічную службу Віцебшчыны і за тры гады работы стаў сапраўдным настаўнікам маладых: вучыў іх сакрэтам хірургічнага майстэрства ва ўсіх раёнах і гарадах вобласці, у любы час сутак прыходзіў на дапамогу ў цяжкіх сітуацыях — ніколі не адмаўляў ні ўрачам, ні хворым.

Пасля скрупулёзных навуковых даследаванняў Міхаілу Рыгоравічу скарылася новая вяршыня — абарона доктарскай дысертацыі. У 1978-м Сачаку было прысвоена званне прафесара, а праз год яго прызначылі рэктарам Віцебскага медыцынскага інстытута, дзе цягам 17 гадоў былі адкрыты завочнае аддзяленне фармацэўтычнага факультэта, факультэты падрыхтоўкі замежных грамадзян і ўдасканалення ўрачоў, 6 новых кафедраў, уведзены ў эксплуатацыю вучэбны лабараторна-тэарэтычны корпус, спартыўная зала, сталовая, два студэнцкія інтэрнаты, 80-кватэрны жылы дом, рэканструявана цэнтральная навукова-даследчая лабараторыя.




Сёння прафесар узначальвае кафедру шпітальнай хірургіі, перадае свой багаты вопыт паслядоўнікам. Ён аўтар больш чым 400 навуковых работ, 36 рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходстваў, 13 манаграфій. Разам з вучнямі ён распрацаваў арыгінальныя аперацыі па ўзнаўленні функцыі лёгкага пасля вялікіх рэзекцый трахеі і бронхаў, а таксама метады лячэння апёкаў, гнойных ран, перытаніту, павышэння рэактыўнасці арганізма пры вострых захворваннях органаў брушной поласці. Прафесарам створана навуковая школа, якой можна па праве ганарыцца, а большасць распрацаваных методык аператыўных умяшанняў выкарыстоўваецца ў рабоце спецыялізаваных аддзяленняў краін СНД.

Ганарыцца Міхаіл Рыгоравіч сваімі вучнямі — прафесарамі Лызіковым і Анічкіным, дацэнтамі Крыштопавым і Цацохам. Не можа не ўзгадаць і таго, каму некалі перадаў рэктарства, — заслужанага дзеяча навук, доктара медыцынскіх навук, прафесара Косінца (нядаўна прызначанага, як вядома, кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь).

Міхаіл Рыгоравіч лічыць сябе шчаслівым. Злавацца не ўмее, дрэннага настрою ў яго практычна не бывае, не сварыцца, не панікуе, ніколі не апускае рукі. Шмат гадоў студэнты прызнаюць Сачака найлепшым выкладчыкам універсітэта. Бо ён добрасумленны і добразычлівы, просты і даступны, начыста пазбаўлены фанабэрыі. Падчас нядаўніх урачыстасцяў, прысвечаных 80-годдзю Віцебскага дзяржмедуніверсітэта, прафесару быў уручаны сімвал «Прызнанне» — рука са скальпелем — і сертыфікат Міністэрства аховы здароўя рэспублікі і Беларускай асацыяцыі хірургаў на валоданне гэтым сімвалам.

З Міхаілам Рыгоравічам па жыцці амаль 60 гадоў крочыла яго жонка, сябар і калега Лідзія Якаўлеўна Супрун, доктар медыцынскіх навук, прафесар, якая доўгія гады ўзначальвала кафедру акушэрства і гінекалогіі медуніверсітэта. Яны рыхтаваліся адзначыць брыльянтавае вяселле, але летась яе не стала… Дачка Марына абараніла доктарскую дысертацыю, працуе дырэктарам РНПЦ медыцынскіх тэхналогій, інфарматызацыі, кіравання і эканомікі аховы здароўя. Другая дачка, Святлана — урач, унук Канстанцін — галоўны ўрач клінікі ВДМУ. Унук Міхаіл скончыў факультэт міжнародных адносін Белдзяржуніверсітэта, добра валодае кітайскай і англійскай мовамі, працуе ў Маскве. Летась студэнтам лячэбнага факультэта медуніверсітэта стаў праўнук Мікіта.

Сам жа спадар Сачак нядаўна адзначыў 86-годдзе.

**Таццяна КУЗЬМІЧ. Фота аўтара.**

■ Узроставая праблема

# ІНСУЛЬТ НЕМАГЧЫМА ПРАДБАЧЫЦЬ?



**Інсульты часцей здараюцца ў пажылых — большасць сардэчна-сасудзістых захворванняў звязана з пасталеннем арганізма. Ужо з 50 гадоў чалавек уваходзіць у групу рызыкі, нагадвае <u>намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Ларыса ДЗЯНІСАВА</u>.**

Больш за ўсё сасуды галаўнога мозга пакутуюць пры атэрасклерозе, артэрыяльнай гіпертэнзіі і цукровым дыябеце, тым больш пры іх спалучэнні. Так аднойчы здараецца інсульт, або сасудзісты мазгавы ўдар, які развіваецца ў выніку пагаршэння кровазабеспячэння галаўнога мозга. Гэта вострае парушэнне суправаджаецца раптоўным расстройствам мазгавых функцый.

Вядома, што нервовыя клеткі мозга «кіруюць» усімі функцыямі арганізма: рухамі рук, ног, маўленнем, абменам рэчываў, дыханнем і кровазваротам, аналізуюць зрокавую, слыхавую інфармацыю і іншыя сігналы, якія паступаюць ад органаў пачуццяў. Пры гэтым кожная з палавін мозга забяспечвае і кантралюе функцыянаванне процілеглай паловы цела. Таму пашкоджанне адной паловы мозга праяўляецца паталагічнымі зменамі на супрацьлеглым баку цела (інсульт злева прыводзіць да расстройства функцый правай паловы цела, і наадварот).

Парушацца могуць тонус мышцаў, зрок, слых, нюх, маўленне, глытанне і г.д. Суправаджацца гэта можа і парушэннем прытомнасці, галаўным болем, млоснасцю, ванітамі. Калі ўсё гэта назіраецца на працягу менш чым 24 гадзіны, а пасля поўнасцю знікае, то гэта — транзіторная ішэмічная атака. Парушэнне мазгавога кровазвароту ў такім выпадку заканчваецца аднаўленнем парушаных функцый.

Прадбачыць інсульт немагчыма. Як і прыпыніць за паўгадзіны да наступлення. Усё адбываецца вельмі хутка. Нават калі ў чалавека сардэчная арытмія, то сказаць, калі адбудзецца інсульт, немагчыма — можа быць, праз месяц, а можа, і ніколі.

**Што можна і трэба рабіць, дык гэта змагацца з фактарамі рызыкі. Вось яны:**

*курэнне і іншае ўжыванне тытуню, няправільнае харчаванне, адсутнасць фізічнай актыўнасці, гіпертэнзія (павышаны крывяны ціск), цукровы дыябет, павышаны халестэрын крыві (гіперліпідэмія). Парушэнне рытму сэрца — мерцальная арытмія можа спрыяць развіццю тромбаў, якія могуць адлятаць у галаўны мозг. Нельга скідваць з рахунку і спадчынны фактар.*

## Бывае такім

**Ішэмічны інсульт** («інфаркт мозга») звязаны са спыненнем або значным змяншэннем кровазабеспячэння ўчастка мозга. Звязана гэта часцей за ўсё з атэрасклератычнымі бляшкамі ў артэрыях, што забяспечваюць мозг крывёй. Бывае, у гэтыя артэрыі трапляе тромб, які сфарміраваўся ў поласцях сэрца ў хворых з сардэчнымі парокамі. Часцей ішэмічны інсульт развіваецца ў 50–69 гадоў. У мужчын часцей, чым у жанчын.

**Гемарагічны інсульт** — гэта кровазліццё ў галаўным мозгу на фоне артэрыяльнай гіпертэнзіі. Зрэдку такое кровазліццё назіраецца ў людзей 39–49 гадоў, звычайна — у тых, каму 50–69. Да 60 гадоў захваральнасць у мужчын і жанчын аднолькавая, а пасля 60 гадоў гемарагічныя інсульты часцей развіваюцца ў жанчын. Прычынай становіцца разрыў анеўрызмы сасудаў мозга (праз гіпертанічную хваробу, атэрасклероз артэрый галаўнога мозга, траўмы).

**Прадбачыць інсульт немагчыма. Як і прыпыніць за паўгадзіны да наступлення. Усё адбываецца вельмі хутка.**

## Як западозрыць?

◆ Раптоўная слабасць рук ці ног

◆ Змены на твары (крывая ўсмешка, страта ці пагаршэнне зроку), парушэнне маўлення

Сімптомы недастатковасці мазгавога кровазвароту (яны павышаюць рызыку развіцця інсульту):

◆ больш частыя і моцныя галаўныя болі на працягу некалькіх месяцаў ці гадоў

◆ галавакружэнні, шум у галаве

◆ зніжэнне памяці, зніжэнне працаздольнасці, заўважнае навакольным.

Галоўнае правіла пры падазрэнні на інсульт — хуткая шпіталізацыя. Першы тыдзень пасля інсульту з'яўляецца крытычным. У гэты час вельмі важна стымуляваць увесь жыццёвы патэнцыял і накіраваць яго на рэабілітацыю.

## Абследаванне

Для распазнавання парушэнняў мазгавога кровазвароту выкарыстоўваецца камп'ютарная і магнітарэзанансная тамаграфіі. Для высвятлення прычын ішэмічнага інсульту прымяняюць ультрагукавыя метады даследавання — дуплекснае скaніраванне сасудаў шыі і доплерафграфія цэрэбральных артэрый.

## Аднаўленне

У адных людзей пасля перанесенага захворвання адбываецца амаль поўнае ці нават поўнае аднаўленне ўсіх функцый, у той час як нехта перажывае значныя цяжкасці нават праз год. Маштаб і глыбіня пашкоджання будуць іграць тут вызначальную ролю. Аднак калі чалавек не загінуў у першыя гадзіны пасля інсульту і перажыў востры перыяд, гэта ўжо сведчыць пра магчымасць аднаўлення парушаных функцый.

Прэпаратаў, якія б аднаўлялі страчаную функцыю мозга, яшчэ не прыдумалі. «Сасудзістыя» і «метабалічныя» лекі на аднаўленне ніяк не ўплываюць. Рэабілітацыя заключаецца ў розных відах трэніровак, зняцці мышачнага спазму і інш. Урэшце, і якаснае лячэнне, і рэгулярнае выкананне складзенай праграмы рэабілітацыі, а таксама падтрымка членаў сям'і могуць палепшыць агульны вынік.

## Што есці хвораму?

У ежы павінна быць дастаткова вітамінаў і мінералаў. Пры дэфіцыце прызначаюцца полівітамінныя прэпараты.

Ляжачым хворым праз іх схільнасць да запораў вельмі карысная гародніна, асабліва буракі, а таксама сухафрукты, кісламалочныя прадукты.

**Наш мозг настолькі адчувальны да недастатковага паступлення крыві, што ўчасткі, пазбаўленыя нармальнага кровазабеспячэння, гінуць цягам некалькіх хвілін.**

Пры гіпертанічнай хваробе ў рацыён неабходна ўключаць прадукты, багатыя на калій (курага, разынкі, інжыр, капуста, бульба), магній (кашы з грэцкай і аўсянай круп). Неабходна абмяжоўваць соль, салодкае, тлустае, вэнджанае, вострае. Не ўжываць моцныя чай і каву, алкаголь.

Памятайце пра каштоўныя прадукты: яблыкі, лімоны, бананы, апельсіны, грэйпфруты, чырвоны вінаград, салодкі перац, слівы, клубніцы, бабы, квяцістую капусту, моркву, спаржу, бульбу, часнок, цыбулю, цёмны шакалад.

## Пра стрэс

Сам па сабе ён не з'яўляецца прычынай інсульту. Аднак стрэс — гэта рэакцыя арганізма на моцны раздражняльнік, у выніку чаго ў кроў выкідваецца адрэналін, які павышае артэрыяльны ціск. А высокі ціск — ужо фактар рызыкі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Асаблівасці харчавання

# ГЭТЫ НАВЯЗЛІВЫ СВЕРБ

**Ужыванне тых ці іншых прадуктаў здольнае абвастраць некаторыя скурныя захворванні. Што гэта за прадукты і захворванні, расказвае ўрач-дэрматавенеролаг Мінскага гарадскога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансера Надзея МІЛЬКОТА.**

## Псарыяз

Парушэнне абменных працэсаў пры гэтым захворванні з'яўляецца падставай для прызначэння індывідуальнай дыеты — у залежнасці ад стадыі прагрэсіравання захворвання, наяўнасці спадарожных захворванняў і такіх ускладненняў, як поліартрыт, экзэма і інш.

### Важна

Вытрымліваць рэжым харчавання, не пераядаць, не ўжываць тлустае мяса, вэнджанае, вострае, здобу, гародніну, багатую на эфірныя алеі. Абсалютна забаронены алкаголь. Рэкамендуецца дыета з абмежаваннем прадуктаў і харчовых рэчываў, якія ўзрушваюць нервовую сістэму (мяса, рыба, моцны чай і кава, соль). Неабходна атрымліваць з ежай больш вітаміну С, калію, магнію, ёду, клятчаткі, пекцінаў. Калі ёсць лішняя вага, абмяжоўваць цукар і пшанічны хлеб, жывёльны тлушч замяніць на раслінны. 1–2 разы на тыдзень — разгрузачныя дні: тваражныя, малочныя (кефірныя), гароднінныя, яблычныя.

### Можна

✓ Масла, аліўкавы, сланечнікавы, кукурузны алей.

✓ Вегетарыянскія супы з гароднінай, крупамі, лапшой, суп малочны, фруктовы.

✓ Мяса: ялавічына, цяляціна, трус у выглядзе паравых катлет, фрыкадэлек, кнэляў, суфле. Каўбасы: дыетычная, доктарская. Сасіскі ялавічныя.

✓ Нятлустая рыба: траска, судак, сазан, навага і інш.

✓ Тварог свежы, лепей абястлушчаны, кефір, сыракваша, ацыдафільнае малако, малако, смятана — толькі для запраўкі страў.

✓ Яйкі пераважна для гатавання страў. Бялковы амлет. Асобна ўсмятку не больш за 1 яйка ў суткі.

✓ Свежая і сырая гародніна (морква, капуста, агуркі, памідоры). У адвараным выглядзе працёртыя буракі, бульбяное пюрэ, зялёны гарошак, квяцістая капуста, кабачкі. Цыбуля толькі вараная!

✓ Фрукты салодкія, спелыя, мусы, жэле, падлівы. Курага, чарнасліў, разынкі.

✓ Салодкае: мёд, варэнне, пасціла, мармелад, нясдобнае пячэнне.

✓ Закускі: салаты, вінегрэты, заліўная рыба, зрэдку — вымачаны селядзец.

✓ Вадкія кашы: грэцкая, аўсяная, рысавая, манная.

### Нельга

× Сала, маргарын.

× Супы на мясным, рыбным, грыбным булёнах, кіслая і тлустая капуста, баршчы.

× Свініна, кумпяк, тлустая каўбаса, свіныя сардэлькі і сасіскі, мясныя кансервы.

× Тлустая рыба: асятровыя і інш.

× Вяршкі, востры сыр, тлустыя падлівы.

× Крутыя і сырыя яйкі, яечніца-глазунья.

× Квашаная і салёная гародніна, марынады, бабы, гарох, фасоля, чачавіца, шчаўе, гародніна, багатая на эфірныя алеі (часнок, рэдзька, радыска).

× Кіслыя няспелыя фрукты, арэхі.

× Шакалад, цукеркі, торты, пірожныя, марожанае.

× Перац, гарчыца, воцат, хрэн, маянэз, вэнджанае, грыбы.

## Нейрадэрміт, экзэма

Значэнне лячэбнага харчавання ў тэрапіі алергічных, са свербам, захворванняў скуры відавочнае, таму што большая колькасць з названых хваробаў узнікае праз паталагічна зменены абмен рэчываў, прычынамі якога могуць быць функцыянальныя расстройствы або захворванні органаў стрававання, харчовая інтаксікацыя, дысбактэрыёз, ідыясінкразія. Лячэбнае харчаванне ў гэтым выпадку таксама патрабуе індывідуальнага падыходу — уліку канстытуцыі, узросту, прафесіі і г.д.

**Нярэдка прычынай упартай крапіўніцы, экзэмы, нейрадэрміту з'яўляюцца малако, масла, суніцы, клубніцы, ракі, рыбныя і інш. прадукты.**

Нярэдка прычынай упартай крапіўніцы, экзэмы, нейрадэрміту з'яўляюцца малако, масла, суніцы, клубніцы, ракі, рыбныя і інш. прадукты.

Харчаванне, багатае хутказасваяльнымі вугляводамі (цукар, салодкія напоі), павялічвае схільнасць да запаленчых працэсаў. Аднак зусім без вугляводаў нельга, проста яны павінны быць «складанымі» — грэцкая каша, адвараная бульба з алеем, морква, буракі, тушаны тапінамбур. Цукар лепей замяняць цукразаменнікамі, мармеладам, выробленым на сарбіце, цукеркамі на сахарыне.

Для алергікаў вельмі карысныя будуць гародніна і фрукты, якія нармалізуюць работу кішэчніка, а таму трэба ўключыць у меню вінегрэт з алеем, гароднінныя і фруктовыя супы, вараную капусту.

Пры экзэме вострай ці падвострай варта пазбягаць вострага, салёнага, вэнджанага, яечнага бялку, мясных супоў, каўбас, дзічыны, смажанага мяса, кансерваў, піва, какавы, моцнага чаю.

Пры экзэме хранічнай забараняюцца толькі тыя прадукты, якія яўна выклікаюць пагаршэнне, абвастрэнне захворвання. Калі ўстанавіць іх не ўдаецца, трэба пазбягаць тых прадуктаў, што забараняюцца пры вострай экзэме.

## Алергіі

### Пад забаронай

× Малако, яйкі, курынае мяса, ікра, морапрадукты, грыбы, арэхі, мёд, цытрусавыя, клубніцы, суніцы, маліна, ананас, дыня, хурма, вінаград, банан, гранат, таматы, морква, буракі, гарох, сельдэрэй, пшаніца, жыта, шакалад, кава, какава — усё гэта павышае адчувальнасць арганізма да ўздзеяння розных раздражняльнікаў.



× Мясныя, курыныя, рыбныя і грыбныя булёны, вострыя прыправы, часнок, рэдзька, радыска, сырая цыбуля, гарчыца, хрэн, перац, салёныя прадукты — усё, што змяшчае экстраактыўныя рэчывы і эфірныя алеі.

× Кансерваваныя прадукты, харчовыя дабаўкі (фарбавальнікі, кансерванты, эмульгатары, араматызатары), праз што пад забарону трапляюць, напрыклад, чыпсы, сухарыкі і інш.

× Марожанае, пірожныя, торты, газіраваныя напоі, жуйкі.

### Дазваляюцца

✓ Кісламалочныя прадукты (кефір, смятана, тварог), яечны жаўток.

✓ Рафінаваны сланечнікавы, аліўкавы алеі, абмежавана — масла.

✓ Вараная ялавічына, цяляціна, нятлустая свініна, трус, індычка, бараніна. Алергенная актыўнасць рознага мяса зніжаецца пры замарожванні і паступовым размарожванні, вымочванні, працяглай варцы.

✓ Кашы — грэцкая, аўсяная, пярловая, кукурузная, рысавая — на вадзе.

✓ Гародніну пажадана вымачыць у халоднай вадзе 1–2 гадзіны. Капуста, рэпа, кабачкі, пацісоны, гарбуз, салат, непарніковыя агуркі, бульба.

✓ Яблыкі (антонаўка, белы наліў). Калі добра пераносяцца — чарніцы, журавіны, сліва, вішня, буякі, брусніцы, агрэст, груша.

✓ Чай (цукар абмяжоўваць) без фруктовых дабавак, мінеральная вада без газу, кампот з сухафруктаў і свежых фруктаў і ягад, указаных вышэй.

✓ Хлеб белы, чорны, шэры, пячэнне «Крэкет».

# ТЫ Ж ГАРЫШ!

**Калі тэмпература не перавышае 38–38,5 градуса, не спяшайцеся яе збіваць. Дайце арганізму пазмагацца з узбуджальнікамі прастуды, грыпу, вострых рэспіраторных вірусных інфекцый. Некантралюемы прыём гарачкапаніжальных сродкаў спыніць імунітэт. Аднак калі тэмпература няўхільна «паўзе» ўверх, прымайце меры. Пры вельмі высокай тэмпературы хворы становіцца бездапаможным, а таму павінен быць нехта, хто паклапоціцца пра яго і зробіць наступнае:**

**1.** Прыкладзе халадная ваты кампрэс на лоб.

**2.** Дасць выпіць гарачкапаніжальны сродак.

Такія лекі трэба прымаць **вельмі асцярожна.** У аптэках на гэты выпадак прапануецца шырокі асартымент: парацэтамол, ібупрафен, аспірын. Для дзяцей высокая тэмпература вельмі небяспечная, а таму званіце ў «хуткую».

**3.** Падасць піць піццё, каб папярэдзіць абязводжванне. Падыдуць чай з мёдам і лімонам, вада з абляпіхавым або малінавым варэннем, сокі, мінеральная вада без газу, морсы. Чым мацней хворы будзе пацець, тым ніжэй будзе тэмпература.

**4.** Можна паспрабаваць расціранні — адэкалонам, спіртам, гарэлкай, воцатам, разведзеным у вадзе, ці хоць бы проста вадой. Высыханне раствору зніжае тэмпературу цела. Пасля гэтай працэдуры не трэба адразу ўкрываць ці апранаць хворага. Толькі праз нейкі час трэба падаць піжаму ці спартыўныя штаны з футболкай. І зноў падаць чай з ліпай, рамонкам і мёдам. Пры тэмпературы трэба піць шмат і часта.

**5.** Праветрыць пакой, зрабіць вільготную ўборку.

Пры моцнай гарачцы і ванітах выкарыстоўваюць нават рэктальныя свечкі.



### Гэта важна

*У хатніх умовах і сваімі сіламі можна вылечыць толькі самыя лёгкія прастудныя захворванні.*

*З пытаннем, чаму ў дарослага або дзіцяці трымаецца тэмпература 38 градусаў без нейкіх іншых сімптомаў, лепей звяртаца да спецыяліста — тэрапеўта або педыятра. За такім станам можа хавацца абсцэс, інфекцыя мочапалавой сістэмы, малярыя, тыф, інфаркт, наступствы траўмы і г.д. Урач пасля агляду, хутчэй за ўсё, прызначыць пэўныя даследаванні — аналіз мачы і крыві, пасеў макроты і інш. Не лянуйцеся здаваць самыя простыя аналізы — для спецыяліста яны вельмі інфарматыўныя.*

*Так, толькі па аналізе крыві можна меркаваць, якая інфекцыя вас напаткала — вірусная ці бактэрыяльная.*

■ Ракавыя абставіны

# КАЛІ ВЫ ЦЭНІЦЕ ЖЫЦЦЁ

**Звяртацца сёння да народных лекараў пры лячэнні анкалогіі — цемрашальства. Часам хворы, напрыклад, праходзіць хіміятэрапію, фактычна ўжо лічыцца здаровым, але раптам хапаецца за «народныя сродкі», і гэта забівае пацыента. Калі ён ужываў нейкія атрутныя рэчывы, то тут і тлумачыць няма чаго, а калі гэта быў, умоўна кажучы, «чайны грыб», то хворага можа загубіць адмаўленне ад працягу хіміятэрапеўтычнага лячэння праз неабгрунтаваную веру ў цуд. Давярайце ўрачам — яны сапраўды выратавалі многіх.**

У зніжэнні смяротнасці ад анкалагічных захворванняў ільвіную долю займае прафілактыка, крыху менш — ранняя дыягностыка, яшчэ менш — удасканаленне лячэння. Чалавек здольны дапамагчы сабе сам.

— Нельга адмаўляцца ад флюараграфіі.

— Жанчынам любога ўзросту трэба рэгулярна (у ідэале раз на год) наведваць гінеколага (для забору мазка і агляду малочнай залозы).

### Трэба ведаць

***Ракавыя пухліны, якія развіваюцца на вонкавых або ўнутраных паверхнях арганізма, напрыклад пухліны скуры, кішэчніка, называюцца карцыномамі. Гэта найбольш часты від пухлін у свеце, у тым ліку і ў нас.***

***У апорных тканках арганізма — касцях і мышцах — развіваюцца саркомы.***

***У лімфатычных вузлах і імунай сістэме — лімфомы.***

***У косным мозгу — лейкеміі.***

— Жанчынам пасля 45 гадоў — раз у два гады рабіць мамаграфію.

— Мужчынам пасля 60 гадоў — здаваць кроў на прастатспецыфічны антыген (ПСА).

— Мужчынам і жанчынам пасля 50–60 гадоў — праходзіць абследаванне страўніка (гастраскапію) і кішэчніка (каланаскапію).

— Сачыць за харчаваннем — менш ежы жывёльнай, больш расліннай. Захапленне мясам і вэнджаным павялічвае рызыку некаторых захворванняў, у тым ліку раку прастаты.

— Што вам рабіць з курэннем, вы ведаеце і самі (кінуць курыць!).

У нашай краіне ажыццяўляецца скрынінг (абследаванне пацыентаў, якія не маюць ніякіх скаргаў на здароўе) па некалькіх відах раку.

**Рак малочнай залозы.** Скрынінг праводзіцца на базе сталічных паліклінік Савецкага раёна. Здаровыя жанчыны ва ўзросце 50–65 гадоў абследуюцца на мамографе. Здымкі праглядаюцца не адным, як звычайна, а двума ўрачамі-рэнтгенолагамі. Калі патрабуецца дааследаванне (ультрагук, біяпсія) або лячэнне, яно праводзіцца на базе гарадскога анкалагічнага дыспансера.

**Рак прастаты.** Скрынінг завяршыўся ў Першамайскім, Маскоўскім, Заводскім раёнах сталіцы. Тэрапеўты на звычайным прыёме накіроўваюць усіх мужчын ва ўзросце пасля 65 гадоў на аналіз крыві на прастатспецыфічны антыген.

**Рак шыйкі маткі.** Скрынінг праводзіцца на базе жаночых кансультацый горада. Усе пацыенткі здаюць мазкі, якія адпраўляюцца на цыталагічнае даследаванне.

**Рак тоўстага кішэчніка.** Скрынінг ажыццяўляецца ў паліклініках Салігорска. Мужчыны і жанчыны ва ўзросце 55–60 гадоў абследуюцца на схаваную кроў у кале. Для гэтага прымяняецца спецыяльная тэст-сістэма. Даследаванне трохразовае. Калі хоць адзін з тэстаў станоўчы, пацыенту выконваецца каланаскапія.

**Матэрыялы выпуску падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ЦЯРНІСТЫ ШЛЯХ ВЯРТАННЯ

## Што чакае Вікторыю Азаранку ў новым сезоне

**Марціна Хінгіс, Марыя Шарапава, Сірэна Уільямс... Гэта далёка не ўвесь спіс вялікіх тэнісістак, якія здолелі пасля сур'ёзных траўм вярнуцца на колішні высокі ўзровень. Нават больш. Шарапава, напрыклад, пасля аперацыі на плячы двойчы выйграла «Ралан Гарос» і дасягнула другога месца ў сусветным рэйтынгу. А Уільямс-малодшая, чыя далейшая кар'ера ў 2010 годзе аказалася пад пагрозай праз лёгачную эмбалію, не толькі перамагла хваробу, але і вярнулася яшчэ мацнейшай, чым раней: выйграла пяць «грандслэмаў», два алімпійскія «золаты» і стала самай узроставай першай ракеткай свету. Прыклады гэтых спартсменак натхняюць, праўда?**

Прыма айчыннага тэніса Вікторыя Азаранка таксама праходзіла праз штосьці падобнае. У 2010 годзе пасля шэрагу дробных траўм і крыўдных ранніх пройгрышаў Віка нават падумвала завяршыць кар'еру. Але ўсё ж такі вырашыла не прымаць паспешных рашэнняў... У выніку гэта гісторыя скончылася двума тытуламі на Australian Open, двума алімпійскімі медалямі і званнем найлепшай тэнісісткі свету. Яна на ўзлёце — і вось новы выклік.

У мінулым сезоне Азаранка правяла толькі 24 матчы. Траўма галёнкаступнёвага сустава, якую тэнісістка атрымала на Australian Open, і раннія спробы вярнуцца на корт каштавалі вельмі дорага. Ужо пасля, аналізуючы гэты кашмарны сезон, Віка прызнаецца: «Спачатку я не была сумленнай з сабой, мне цяжка было прызнаць, што я сутыкнулася з сур'ёзнай праблемай, якую не так проста вырашыць». Адчуць сябе больш-менш здаровай тэнісістка змагла толькі ў самым канцы сезона. Азаранка зноў выходзіць на вялікую пляцоўку, дасягае чвэрцьфіналу US Open, дзе саступае першай сур'ёзнай саперніцы, і прымае рашэнне датэрмінова скончыць сезон. Большасць рэйтынгавых ачкоў згублена, месца ў дзясятцы сусветнага рэйтынгу быццам бы ніколі не было, упэўненасць у сабе пахіснулася... Трэба пачынаць усё з нуля.



**Амбіцыйнасць і здаровы дух саперніцтва — ужо толькі гэтыя якасці змогуць выцягнуць беларускую тэнісістку з рэйтынгавай ямы, куды яна неўзабаве трапіла.**

«Шчыра кажучы, я ніколі не была так матывавана, як зараз», — распавядала тэнісістка перад стартам новага сезона ў інтэрв'ю сусветна вядомаму выданню New York Times. Гэта адказ усім скептыкам, якія ўжо паспяшаліся спісаць беларускую спартсменку з рахункаў. Так, трыумфальнага вяртання не атрымалася: на стартавым турніры ў аўстралійскім Брысбэне Азаранка прайграла ў першым жа паядынку маладой і небяспечнай чэшцы. Але гэта не было падобна да паказальнага лупцавання экс-чэмпіёнкі — звычайны працоўны матч з разраду «Бітвы пакаленняў». У рэшце рэшт, і Сірэна Уільямс, здаровая, у самым росквіце сіл, у мінулым сезоне саступала на «Ралан Гарос» такой жа маладой і перспектыўнай тэнісістцы з Іспаніі!

Мудры французскі трэнер Вікторыі Азаранкі Сэм С'юмік так характарызаваў сваю падапечную: «Калі вы захочаце зрабіць на вячэру лазанню, яна захоча зрабіць лазанню лепшую за вашу». Амбіцыйнасць і здаровы дух саперніцтва — ужо толькі гэтыя якасці змогуць выцягнуць беларускую тэнісістку з рэйтынгавай ямы, куды яна неўзабаве трапіла (цяпер Азаранка займае 44-е месца ў сусветнай класіфікацыі. — **Аўт.**). А калі дадаць да гэтага гульнявы вопыт і няспынную працу над сабой, можна паспрабаваць і горы зрушыць.

Сёлета ў Мельбурне, дзе Вікторыя тры гады таму ўпершыню ўзняла над галавой запаветны Кубак, наша тэнісістка будзе лічыцца андэрдогам. Прэтэндэнтак на тытул, як ніколі, вельмі шмат — і сярод старой гвардыі, і сярод дзёрзкай моладзі. Пры ўдалым для беларускі раскладзе (вынік матча першага круга вы ўжо ведаеце. – **Аўт.**) у другім раўндзе Вікторыю, хутчэй за ўсё, будзе чакаць яе сяброўка і адна з самых прынцыпіяльных саперніц – Каралін Вазняцкі. У адрозненне ад нашай спартсменкі, датчанка зараз перажывае новы пік у спартыўнай кар'еры і небяспечная як ніколі. У любым выпадку ўжо ў другім раўндзе Australian Open гледачы могуць атрымаць суперматч з шыкоўнай афішай. А хто будзе мацнейшым, разважыць яго Вялікасць Тэніс!

# АДСТАВАННЕ ХУТКА СКАРАЧАЕЦЦА...

**У традыцыйным спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра поспехі Дар'і Домрачавай на нямецкіх этапах Кубка свету, узмацненне футбольнага «Дынама-Мінск» і дасягненне беларускай каманды на ралі «Дакар».**

**1.** Дар'я Домрачава хуткімі тэмпамі скарачае адставанне ад Кайсы Макарайнен у барацьбе за Вялікі хрустальны глобус. **На этапе Кубка свету ў нямецкім Рупольдзінгу трохразовая алімпійская чэмпіёнка двойчы ўзнімалася на подыум.** Спачатку па выніках спрынтарскай гонкі: у ёй Домрачава фінішавала другой. А пасля наша біятланістка разменяла «серабро» спрынту на «золата» масстарту. І калі ў кароткай гонцы на 7,5 км у Дар'і, як кажуць, «не каціліся лыжы», то на сваёй каронннай дыстанцыі наша прыма паказала абсалютна найлепшы ход.



Дар'я Домрачава амаль што дагнала Кайсу Макарайнен у агульным заліку Кубка свету.

Кайса Макарайнен, дарэчы, ужо другі этап запар застаецца без месца на п'едэстале. Такім чынам, менш чым за два тыдні стаачковая фора фінскай біятланісткі скарацілася амаль што ўдвая і цяпер складае ўсяго толькі 58 ачкоў.

І яшчэ адна падстава парадавацца за беларускі біятлон — «серабро» у жаночай эстафеце. Гэта ўжо трэці подыум для нашых дзяўчат у гэтым сезоне. Адзначым, што ў Рупольдзінгу за беларускую каманду дэбютавала Ірына Крыўко, якая, між іншым, свой этап правяла «на нуль», не скарыстаўшы ніводнага дадатковага патрона. Ці застанецца дэбютантка на пазіцыі чацвёртага нумара, даведаемся ўжо ў нядзелю. Новы этап Кубка свету стартуе ў пятніцу, месца дзеяння — італьянская Антэрсэльва.

